Б 34
Ба 68 895

# КРЫМІНАЛЬНЫ КОДЭКС

## БЕЛАРУСКАЙ ССР

Б 34/К85

Б 68895
Бел. аддзел
1994 г.

Ба 68895

*Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!*

# КРЫМІНАЛЬНЫ КОДЭКС
## БЕЛАРУСКАЙ ССР

(на беларускай і рускай мовах)

Б 68895
Бел. аддзел 1994 г.

ДЗЯРЖАЎНАЕ ВЫДАВЕЦТВА БССР
Рэдакцыя навукова-тэхнічнай літаратуры
МІНСК 1961

Дзяржаўная бібліятэка БССР імя В. І. Леніна

25. 11 4. 2009

# ЗАКОН

## АБ ЗАЦВЯРДЖЭННІ КРЫМІНАЛЬНАГА КОДЭКСА БЕЛАРУСКАЙ ССР

Вярхоўны Савет Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі **пастанаўляе:**

**Артыкул 1.** Зацвердзіць Крымінальны кодэкс Беларускай ССР і ўвесці яго ў дзеянне з 1 красавіка 1961 года.

**Артыкул 2.** Устанавіць, што артыкул 23 Крымінальнага кодэкса Беларускай ССР не пашыраецца ў частцы тэрміну пазбаўлення волі на асоб, асуджаных да прыняцця Асноў крымінальнага заканадаўства Саюза ССР і саюзных рэспублік ад 25 снежня 1958 года за асабліва небяспечныя дзяржаўныя злачынствы, прадугледжаныя раздзелам шостым Асаблівай часткі Крымінальнага кодэкса Беларускай ССР, за бандытызм, наўмыснае забойства пры абцяжваючых акалічнасцях, крадзеж дзяржаўнай або грамадскай маёмасці ў буйных размерах і разбой.

**Артыкул 3.** Даручыць Прэзідыуму Вярхоўнага Савета Беларускай ССР устанавіць парадак увядзення ў дзеянне Крымінальнага кодэкса Беларускай ССР і зацвердзіць пералік заканадаўчых актаў Беларускай ССР, якія страчваюць сілу ў сувязі з увядзеннем Крымінальнага кодэкса Беларускай ССР у дзеянне.

**Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР**
**В. КАЗЛОЎ.**

**Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР**
**Д. ЛУКАШЭВІЧ.**

29 снежня 1960 года, гор. Мінск.

# КРЫМІНАЛЬНЫ КОДЭКС БЕЛАРУСКАЙ ССР

## АГУЛЬНАЯ ЧАСТКА

### РАЗДЗЕЛ I

### АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

Артыкул 1. **Задачы Крымінальнага кодэкса Беларускай ССР**

Крымінальны кодэкс Беларускай ССР мае задачай ахову савецкага грамадскага і дзяржаўнага ладу, сацыялістычнай уласнасці, асобы і правоў грамадзян і ўсяго сацыялістычнага правапарадку ад злачынных замахаў.

Для ажыццяўлення гэтай задачы Крымінальны кодэкс Беларускай ССР вызначае, якія грамадска небяспечныя дзеянні з'яўляюцца злачыннымі, і ўстанаўлівае пакаранні, што павінны быць ужыты да асоб, якія ўчынілі злачынствы.

Артыкул 2. **Крымінальны кодэкс Беларускай ССР і Крымінальнае заканадаўства Саюза ССР**

Крымінальны кодэкс Беларускай ССР зыходзіць з прынцыпаў і агульных палажэнняў Асноў крымінальнага заканадаўства Саюза ССР і саюзных рэспублік.

Агульнасаюзныя законы аб крымінальнай адказнасці за дзяржаўныя і воінскія злачынствы, а таксама агульнасаюзныя законы, якія вызначаюць адказнасць за іншыя злачынствы, накіраваныя супраць інтарэсаў Саюза ССР, уключаюцца ў гэты Кодэкс.

Да ўключэння агульнасаюзных крымінальных законаў у Крымінальны кодэкс Беларускай ССР яны ўжываюцца на тэрыторыі Беларускай ССР непасрэдна.

Артыкул 3. **Падставы крымінальнай адказнасці**

Крымінальную адказнасць і пакаранне нясе толькі асоба, вінаватая ва ўчыненні злачынства, гэта значыць якая наўмысна або па неасцярожнасці ўчыніла прадугледжанае крымінальным законам грамадска небяспечнае дзеянне.

Крымінальнае пакаранне ўжываецца толькі па прыгавору суда.

Артыкул 4. **Дзеянне Крымінальнага кодэкса Беларускай ССР у адносінах да дзеянняў, учыненых на тэрыторыі Беларускай ССР**

Усе асобы, якія ўчынілі злачынствы на тэрыторыі Беларускай ССР, нясуць адказнасць па гэтаму Кодэксу.

Пытанне аб крымінальнай адказнасці дыпламатычных прадстаўнікоў замежных дзяржаў і іншых грамадзян, якія, згодна з дзеючымі законамі і міжнароднымі пагадненнямі, не падсудныя па крымінальных справах савецкім судовым установам, у выпадку ўчынення гэтымі асобамі злачынства на тэрыторыі Беларускай ССР, вырашаецца дыпламатычным шляхам.

У выпадку разгляду судамі Беларускай ССР спраў аб злачынствах, учыненых на тэрыторыі іншых саюзных рэспублік, у адпаведнасці з артыкулам 4 Асноў крымінальнага заканадаўства Саюза ССР і саюзных рэспублік ужываецца крымінальнае заканадаўства, якое дзейнічае ў месцы ўчынення злачынства.

Артыкул 5. **Дзеянне Крымінальнага кодэкса Беларускай ССР у адносінах да дзеянняў, учыненых за межамі СССР**

Грамадзяне СССР, якія ўчынілі злачынствы за граніцай, нясуць крымінальную адказнасць па гэтаму Кодэксу, калі яны прыцягнуты да крымінальнай адказнасці або аддадзены пад суд на тэрыторыі Беларускай ССР.

На тых жа падставах нясуць адказнасць асобы без грамадзянства, што знаходзяцца ў Беларускай ССР, якія ўчынілі злачынствы за межамі СССР.

Калі названыя асобы за ўчыненыя злачынствы панеслі пакаранне за граніцай, суд можа адпаведна змякчыць назначанае ім пакаранне або поўнасцю вызваліць вінаватага ад адбывання пакарання.

Іншаземцы за злачынствы, учыненыя за межамі СССР,

нясуць адказнасць па савецкіх крымінальных законах у выпадках, прадугледжаных міжнароднымі пагадненнямі.

Артыкул 6. **Дзеянне крымінальнага закону ў часе**

Злачыннасць і каральнасць дзеяння вызначаюцца законам, які дзейнічаў у час учынення гэтага дзеяння.

Закон, які ўстараняе каральнасць дзеяння або змякчае пакаранне, мае адваротную сілу, гэта значыць пашыраецца таксама на дзеянні, учыненыя да яго выдання.

Закон, які ўстанаўлівае каральнасць дзеяння або ўзмацняе пакаранне, адваротнай сілы не мае.

РАЗДЗЕЛ 2

## АБ ЗЛАЧЫНСТВЕ

Артыкул 7. **Паняцце злачынства**

Злачынствам прызнаецца прадугледжанае крымінальным законам грамадска небяспечнае дзеянне (дзеянне ці бяздзейнасць), якое робіць замах на савецкі грамадскі або дзяржаўны лад, сацыялістычную сістэму гаспадаркі, сацыялістычную ўласнасць, асобу, палітычныя, працоўныя, маёмасныя і іншыя правы грамадзян, а таксама іншае прадугледжанае крымінальным законам грамадска небяспечнае дзеянне, якое робіць замах на сацыялістычны правапарадак.

Не з'яўляюцца злачынствам дзеянне або бяздзейнасць, якія хоць фармальна і маюць прыкметы якога-небудзь дзеяння, прадугледжанага крымінальным законам, але з прычыны малазначнасці не з'яўляюцца грамадска небяспечнымі.

Артыкул 8. **Учыненне злачынства наўмысна**

Злачынства прызнаецца ўчыненым наўмысна, калі асоба, якая яго ўчыніла, усведамляла грамадска небяспечны характар свайго дзеяння або сваёй бяздзейнасці, прадбачыла яго грамадска небяспечныя вынікі і жадала іх або свядома дапускала наступленне гэтых вынікаў.

Артыкул 9. **Учыненне злачынства па неасцярожнасці**

Злачынства прызнаецца ўчыненым па неасцярожнасці, калі асоба, якая яго ўчыніла, прадбачыла магчымасць наступлення грамадска небяспечных вынікаў свайго дзеяння або сваёй бяздзейнасці, але легкадумна разлічвала на іх папярэ-

джанне або не прадбачыла магчымасці наступлення такіх вынікаў, хоць павінна была і магла іх прадбачыць.

Артыкул 10. **Адказнасць непаўналетніх**

Крымінальную адказнасць нясуць асобы, якім да ўчынення злачынства споўнілася шаснаццаць год.

Асобы, якія ўчынілі злачынства ва ўзросце ад чатырнаццаці да шаснаццаці год, нясуць крымінальную адказнасць толькі за забойства (артыкулы 100—104), наўмыснае нанясенне цялесных пашкоджанняў, якія прычынілі шкоду здароўю (артыкулы 106—109, 110, частка першая), згвалтаванне (артыкул 115), разбойны напад (артыкулы 89 і 143), грабеж (артыкулы 88 і 142), крадзеж (артыкулы 87 і 141), злоснае хуліганства (артыкул 201, частка другая), наўмыснае знішчэнне ці пашкоджанне дзяржаўнай, грамадскай маёмасці або асабістай маёмасці грамадзян, якое выклікала цяжкія вынікі (артыкулы 96, частка другая і 146, частка другая), а таксама за наўмыснае ўчыненне дзеянняў, якія могуць выклікаць крушэнне поезда (артыкул 83).

Калі суд палічыць, што выпраўленне асобы, якая ўчыніла ва ўзросце да васемнаццаці год злачынства, не выклікаючае вялікай грамадскай небяспекі, магчыма без ужывання крымінальнага пакарання, ён можа прымяніць да такой асобы прымусовыя меры выхаваўчага характару, якія не з'яўляюцца крымінальным пакараннем (артыкул 60), або можа вызваліць непаўналетняга ад крымінальнай адказнасці з накіраваннем яго ў камісію па справах непаўналетніх для разгляду пытання аб прымяненні да яго прымусовых мер выхаваўчага характару.

Артыкул 11. **Поўная адсутнасць памяці**

Не нясе крымінальнай адказнасці асоба, якая ў час учынення грамадска небяспечнага дзеяння знаходзілася ў стане поўнай адсутнасці памяці, гэта значыць не магла ўсведамляць сваіх дзеянняў або кіраваць імі з прычыны хранічнай псіхічнай хваробы, часовага расстройства псіхічнай дзейнасці, прыдуркаватасці або іншага хваравітага стану. Да такой асобы па назначэнню суда могуць быць прыменены прымусовыя меры медыцынскага характару, прадугледжаныя артыкулам 55 гэтага Кодэкса.

Не нясе пакарання таксама асоба, што ўчыніла злачынства ў стане поўнай прысутнасці памяці, але да вынясення судом прыгавору захварэла душэўнай хваробай, якая пазб ў-

ляе яе магчымасці ўсведамляць свае дзеянні або кіраваць імі. Да такой асобы па назначэнню суда могуць быць прыменены прымусовыя меры медыцынскага характару, а пасля выздараўлення яна можа быць пакарана.

Артыкул 12. **Адказнасць за злачынства, учыненае ў стане ап'янення**

Асоба, якая ўчыніла злачынства ў стане ап'янення, не вызваляецца ад крымінальнай адказнасці.

Артыкул 13. **Неабходная абарона**

Не з'яўляецца злачынствам дзеянне, якое хоць і падпадае пад прыкметы дзеяння, прадугледжанага гэтым Кодэксам, але ўчынена ў стане неабходнай абароны, гэта значыць пры абароне інтарэсаў Савецкай дзяржавы, грамадскіх інтарэсаў, асобы або правоў абараняючайся або іншай асобы ад грамадска небяспечнага замаху шляхам нанясення робячаму замах шкоды, калі пры гэтым не было дапушчана перавышэння межаў неабходнай абароны.

Перавышэннем межаў неабходнай абароны прызнаецца яўная неадпаведнасць абароны характару і небяспецы замаху.

Артыкул 14. **Крайняя неабходнасць**

Не з'яўляецца злачынствам дзеянне, якое хоць і падпадае пад прыкметы дзеяння, прадугледжанага гэтым Кодэксам, але ўчынена ў стане крайняй неабходнасці, гэта значыць для ліквідацыі небяспекі, пагражаючай інтарэсам Савецкай дзяржавы, грамадскім інтарэсам, асобе або правам данай асобы ці іншых грамадзян, калі гэтая небяспека пры даных акалічнасцях не магла быць ліквідавана іншымі сродкамі і калі нанесеная шкода з'яўляецца менш значнай, чым папярэджаная шкода.

Артыкул 15. **Адказнасць за падрыхтаванне да злачынства і за замах на злачынства**

Падрыхтаваннем да злачынства прызнаецца падшуканне або прыстасаванне сродкаў ці прылад або іншае наўмыснае стварэнне ўмоў для ўчынення злачынства.

Замахам на злачынства прызнаецца наўмыснае дзеянне, непасрэдна накіраванае на ўчыненне злачынства, калі пры гэтым злачынства не было даведзена да канца па прычынах, якія не залежаць ад волі вінаватага.

Пакаранне за падрыхтаванне да злачынства і за замах на

злачынства назначаецца па закону, які прадугледжвае адказнасць за гэтае злачынства. Пры назначэнні пакарання суд улічвае характар і ступень грамадскай небяспекі дзеянняў, учыненых вінаватым, ступень ажыццяўлення злачыннага намеру і прычыны, у выніку якіх злачынства не было даведзена да канца.

Артыкул 16. **Добраахвотная адмова ад учынення злачынства**

Асоба, якая добраахвотна адмовілася ад давядзення злачынства да канца, нясе крымінальную адказнасць толькі ў тым выпадку, калі фактычна ўчыненае ёй дзеянне мае склад іншага злачынства.

Артыкул 17. **Саўдзел**

Саўдзелам прызнаецца наўмысны сумесны ўдзел дзвюх або больш асоб ва ўчыненні злачынства.

Саўдзельнікамі злачынства, побач з выканаўцамі, прызнаюцца арганізатары, падбухторшчыкі і памагатыя.

Выканаўцам прызнаецца асоба, якая непасрэдна ўчыніла злачынства.

Арганізатарам прызнаецца асоба, якая арганізавала ўчыненне злачынства або кіравала яго ўчыненнем.

Падбухторшчыкам прызнаецца асоба, якая схіліла да ўчынення злачынства.

Памагатым прызнаецца асоба, якая садзейнічала ўчыненню злачынства парадамі, указаннямі, прадастаўленнем сродкаў або ліквідаваннем перашкод, а таксама асоба, якая загадзя абяцала скрыць злачынцу, прылады і сродкі ўчынення злачынства, сляды злачынства або прадметы, здабытыя злачынным шляхам.

Ступень і характар удзелу кожнага з саўдзельнікаў ва ўчыненні злачынства павінны быць улічаны судом пры назначэнні пакарання.

Артыкул 18. **Укрывальніцтва**

Загадзя не абяцанае ўкрывальніцтва злачынцы, а таксама прылад і сродкаў учынення злачынства, слядоў злачынства або прадметаў, здабытых злачынным шляхам, выклікае адказнасць толькі ў выпадках, прадугледжаных артыкулам 185 гэтага Кодэкса.

Артыкул 19. **Неданясенне**

Неданясенне аб дакладна вядомым рыхтуемым або ўчыненым злачынстве выклікае крымінальную адказнасць толькі ў выпадках, прадугледжаных артыкуламі 86 і 186 гэтага Кодэкса.

## РАЗДЗЕЛ 3

## АБ ПАКАРАННІ

Артыкул 20. **Мэты пакарання**

Пакаранне не толькі з'яўляецца карай за ўчыненае злачынства, але і мае мэтай выпраўленне і перавыхаванне асуджаных у духу сумленных адносін да працы, дакладнага выканання законаў, павагі да правіл сацыялістычнага супольнага жыцця, а таксама папярэджанне ўчынення новых злачынстваў як асуджанымі, так і іншымі асобамі.

Пакаранне не мае мэтай прычыненне фізічных пакут або прыніжэнне чалавечай годнасці.

Артыкул 21. **Віды пакарання**

Да асоб, якія ўчынілі злачынствы, могуць ужывацца наступныя асноўныя пакаранні:

1) пазбаўленне волі;
2) ссылка;
3) высылка;
4) папраўчыя работы без пазбаўлення волі;
5) пазбаўленне права займаць пэўныя пасады або займацца пэўнай дзейнасцю;
6) штраф;
7) звальненне з пасады;
8) грамадскае ганьбаванне.

Да ваеннаслужачых тэрміновай службы можа таксама ўжывацца пакаранне ў выглядзе накіравання ў дысцыплінарны батальён.

Апрача асноўных пакаранняў, да асуджаных могуць ужывацца наступныя дадатковыя пакаранні:

канфіскацыя маёмасці;

пазбаўленне воінскага або спецыяльнага звання.

Высылка, ссылка, пазбаўленне права займаць пэўныя пасады або займацца пэўнай дзейнасцю, штраф і звальненне з пасады могуць ужывацца не толькі ў якасці асноўных, але і ў якасці дадатковых пакаранняў.

Артыкул 22. **Выключная мера пакарання — пакаранне смерцю**

У выглядзе выключнай меры пакарання, да яе поўнай адмены, дапускаецца ўжыванне пакарання смерцю — расстрэлу — за здраду радзіме (артыкул 61), шпіянаж (артыкул 62), дыверсію (артыкул 65), тэрарыстычны акт (артыкулы 63 і 64), бандытызм (артыкул 74), наўмыснае забойства пры абцяжваючых акалічнасцях, указаных у артыкуле 100 і пункце «в» артыкула 229 гэтага Кодэкса, а ў ваенны час або ў баявой абстаноўцы — і за іншыя асабліва цяжкія злачынствы, у выпадках, спецыяльна прадугледжаных заканадаўствам Саюза ССР.

Не могуць быць прыгавораны да пакарання смерцю асобы, якія не дасягнулі да ўчынення злачынства васемнаццацігадовага ўзросту, і жанчыны, што знаходзіліся ў стане цяжарнасці ў час учынення злачынства або к моманту вынясення прыгавору. Пакаранне смерцю не можа быць ужыта да жанчыны, якая знаходзіцца ў стане цяжарнасці к моманту выканання прыгавору.

Артыкул 23. **Пазбаўленне волі**

Пазбаўленне волі ўстанаўліваецца на тэрмін ад трох месяцаў да дзесяці год, а за асабліва цяжкія злачынствы і для асабліва небяспечных рэцыдывістаў, у выпадках, прадугледжаных заканадаўствам Саюза ССР і гэтым Кодэксам, не звыш пятнаццаці год.

Пры назначэнні пакарання асобе, якая не дасягнула да ўчынення злачынства васемнаццацігадовага ўзросту, тэрмін пазбаўлення волі не можа перавышаць дзесяці год.

Асуджаныя да пазбаўлення волі адбываюць пакаранне ў папраўча-працоўнай калоніі або ў турме, а непаўналетнія — у працоўнай калоніі для непаўналетніх.

Пазбаўленне волі ў выглядзе зняволення ў турме на ўвесь тэрмін пакарання або частку яго можа быць назначана судом асобам, якія ўчынілі цяжкія злачынствы, а таксама асабліва небяспечным рэцыдывістам.

Асобам, якія адбылі не менш як палавіну тэрміну турэмнага зняволення, пры ўмове прыкладных іх паводзін, турэмнае зняволенне можа быць па назначэнню суда заменена ўтрыманнем у калоніі.

Асобам, якія злосна парушаюць рэжым, устаноўлены ў

папраўча-працоўнай калоніі, адбыванне пакарання ў калоніі можа быць па назначэнню суда заменена турэмным зняволеннем працягласцю не звыш трох год з адбываннем тэрміну пакарання, які застаўся, у папраўча-працоўнай калоніі.

Парадак і ўмовы адбывання пазбаўлення волі вызначаюцца папраўча-працоўным заканадаўствам.

Артыкул 24. **Паняцце асабліва небяспечнага рэцыдывіста**

Асабліва небяспечным рэцыдывістам можа быць па прыгавору суда прызнана:

1) асоба, якая была асуджана за асабліва небяспечнае дзяржаўнае злачынства (артыкулы 61—70), бандытызм (артыкул 74), наўмыснае забойства (артыкулы 100, 101 і 229, пункт «в»), наўмыснае цяжкае цялеснае пашкоджанне (артыкул 106), згвалтаванне (артыкул 115), раскраданне дзяржаўнай або грамадскай маёмасці ў вялікіх размерах (артыкулы 87, частка трэцяя, 88, частка трэцяя, 90, частка трэцяя і 91, частка трэцяя), разбой (артыкулы 89 і 143) і зноў учыніла якое-небудзь з пералічаных злачынстваў, незалежна ад таго, за якое з іх гэтая асоба была асуджана першы раз;

2) асоба, якая была двойчы асуджана за крадзеж (артыкулы 87 і 141), махлярства (артыкулы 90 і 144), грабеж (артыкулы 88 і 142), спекуляцыю (артыкул 151), злоснае хуліганства (артыкул 201, частка другая) і за адно са злачынстваў, прадугледжаных пунктам першым гэтага артыкула, і пасля гэтага зноў учыніла крадзеж, махлярства, грабеж, спекуляцыю або злоснае хуліганства;

3) асоба, якая была тройчы асуджана за крадзеж (артыкулы 87 і 141), махлярства (артыкулы 90 і 144), грабеж (артыкулы 88 і 142), спекуляцыю (артыкул 151), злоснае хуліганства( артыкул 201, частка другая) і пасля гэтага ўчыніла якое-небудзь з пералічаных у даным артыкуле злачынстваў.

Суд, разглядаючы пытанне аб прызнанні асобы асабліва небяспечным рэцыдывістам, улічвае характар і ступень грамадскай небяспекі зробленага злачынства, асобу вінаватага і акалічнасці справы.

Пры прызнанні асобы асабліва небяспечным рэцыдывістам не ўлічваюцца злачынствы, учыненыя гэтай асобай ва ўзросце да васемнаццаці год, а таксама тыя злачынствы, па якіх судзімасць была пагашана або знята ва ўстаноўленым законам парадку.

Артыкул 25. **Ссылка**

Ссылка заключаецца ў выдаленні асуджанага з месца яго пражывання з абавязковым пасяленнем у пэўнай мясцовасці.

Ссылка як у якасці асноўнага, так і ў якасці дадатковага пакарання можа назначацца на тэрмін ад двух да пяці год.

Ссылка ў якасці дадатковага пакарання можа ўжывацца толькі ў выпадках, спецыяльна ўказаных у законе.

Працаўладкаванне ссыльных ускладаецца на выканаўчыя камітэты мясцовых Саветаў дэпутатаў працоўных.

Ссылка не ўжываецца да асоб, якія не дасягнулі да ўчынення злачынства васемнаццацігадовага ўзросту, да цяжарных жанчын і да жанчын, што маюць на ўтрыманні дзяцей да васьмігадовага ўзросту.

Парадак, месца і ўмовы адбывання ссылкі ўстанаўліваюцца заканадаўствам Саюза ССР і Беларускай ССР.

Артыкул 26. **Высылка**

Высылка заключаецца ў выдаленні асуджанага з месца яго пражывання з забаронай пражывання ў пэўных мясцовасцях.

Высылка як у якасці асноўнага, так і ў якасці дадатковага пакарання можа назначацца на тэрмін ад аднаго года да пяці год.

Высылка ў якасці дадатковага пакарання можа ўжывацца толькі ў выпадках, спецыяльна ўказаных у законе.

Высылка не ўжываецца да асоб, якія не дасягнулі да ўчынення злачынства васемнаццацігадовага ўзросту.

Парадак і ўмовы адбывання высылкі ўстанаўліваюцца заканадаўствам Саюза ССР і Беларускай ССР.

Артыкул 27. **Папраўчыя работы без пазбаўлення волі**

Папраўчыя работы без пазбаўлення волі назначаюцца на тэрмін ад аднаго месяца да аднаго года і адбываюцца або па месцу работы асуджанага, або ў іншых месцах, у раёне пражывання асуджанага.

З заработку асуджанага да папраўчых работ без пазбаўлення волі робіцца ўтрыманне ў даход дзяржавы ў размеры, установленым прыгаворам суда ў межах ад пяці да дваццаці працэнтаў заработку.

Асобам, прызнаным непрацаздольнымі, суд замест папраўчых работ назначае штраф або грамадскае ганьбаванне.

Час адбывання папраўчых работ, у тым ліку і па месцу работы асуджанага, не залічваецца ў працоўны стаж.

Пры ўмове добрасумленнай работы і прыкладных паводзін асуджанага ў час адбывання папраўчых работ суд пасля адбыцця асуджаным гэтага пакарання, па хадайніцтву грамадскай арганізацыі або калектыву працоўных, можа ўключыць час адбывання папраўчых работ у працоўны стаж.

Артыкул 28. **Вынікі ўхілення ад адбывання папраўчых работ**

У выпадку ўхілення ад адбывання папраўчых работ па месцу работы суд можа замяніць неадбыты тэрмін іх папраўчымі работамі, адбываемымі ў іншых месцах, у раёне пражывання асуджанага.

У выпадку ўхілення ад адбывання папраўчых работ у іншых месцах, у раёне пражывання асуджанага, суд можа замяніць неадбыты тэрмін іх пазбаўленнем волі, прычым кожныя тры дні неадбытага тэрміну папраўчых работ замяняюцца адным днём пазбаўлення волі.

Артыкул 29. **Пазбаўленне права займаць пэўныя пасады або займацца пэўнай дзейнасцю**

Пазбаўленне права займаць пэўныя пасады або займацца пэўнай дзейнасцю можа быць назначана судом на тэрмін ад аднаго да пяці год у якасці асноўнага або дадатковага пакарання.

Гэтае пакаранне можа быць назначана ў выпадках, калі па характару ўчыненых вінаватым злачынстваў па пасадзе або пры заняцці пэўнай дзейнасцю суд прызнае немагчымым пакіданне за ім права займаць пэўныя пасады або займацца пэўнай дзейнасцю.

Пры назначэнні гэтага пакарання ў якасці дадатковага да пазбаўлення волі яно пашыраецца на ўвесь час адбывання пазбаўлення волі і, звыш таго, на тэрмін, устаноўлены прыгаворам.

Калі ж пазбаўленне права займаць пэўныя пасады або займацца пэўнай дзейнасцю назначана ў якасці дадатковага да іншага віду асноўнага пакарання, то тэрмін вылічваецца з моманту пачатку адбывання асноўнага пакарання.

Артыкул 30. **Штраф**

Штраф ёсць грашовае спагнанне, якое накладаецца судом у выпадках і межах, устаноўленых законам.

Размер штрафу ўстанаўліваецца ў залежнасці ад цяжкасці ўчыненага злачынства з улікам маёмаснага становішча вінаватага.

У выпадку немагчымасці спагнання штрафу суд можа пастанавіць аб замене яго папраўчымі работамі без пазбаўлення волі з разліку за дзесяць рублёў штрафу — адзін месяц папраўчых работ, але не звыш аднаго года папраўчых работ.

Замена штрафу пазбаўленнем волі і пазбаўлення волі штрафам не дапускаецца.

Прадметы, якія не падлягаюць канфіскацыі, не могуць быць забраны пры спагнанні штрафу.

Артыкул 31. **Звальненне з пасады**

Звальненне з пасады можа ўжывацца судом у выпадку прызнання немагчымасці пакідання асуджанага на пасадзе, якую ён займае.

Артыкул 32. **Грамадскае ганьбаванне**

Грамадскае ганьбаванне заключаецца ў публічным выражэнні судом ганьбавання вінаватаму з давядзеннем аб гэтым у неабходных выпадках да ведама грамадскасці праз друк або іншым спосабам.

Артыкул 33. **Накіраванне ваеннаслужачых, якія ўчынілі злачынствы, у дысцыплінарны батальён і замена папраўчых работ утрыманнем на гаўптвахце**

Да ваеннаслужачых тэрміновай службы, якія ўчынілі злачынствы, можа ўжывацца накіраванне ў дысцыплінарны батальён на тэрмін ад трох месяцаў да двух год у выпадках, прадугледжаных законам, а таксама ў тых выпадках, калі суд, улічваючы акалічнасці справы і асобу асуджанага, знойдзе мэтазгодным замест пазбаўлення волі на тэрмін да двух год ужыць накіраванне ў дысцыплінарны батальён на той жа тэрмін.

Папраўчыя работы без пазбаўлення волі замяняюцца ваеннаслужачым утрыманнем на гаўптвахце на тэрмін да двух месяцаў.

Артыкул 34. **Канфіскацыя маёмасці**

Канфіскацыя маёмасці заключаецца ў прымусовым бяз-

выплатным адабранні ва ўласнасць дзяржавы ўсёй або часткі маёмасці, якая з'яўляецца асабістай уласнасцю асуджанага.

Канфіскацыя маёмасці можа быць назначана толькі за дзяржаўныя і цяжкія карыслівыя злачынствы ў выпадках, указаных у законе.

Пры канфіскацыі часткі маёмасці суд павінен указаць, якая частка маёмасці канфіскуецца, або пералічыць прадметы, якія канфіскуюцца.

Не падлягаюць канфіскацыі маёмасць і прадметы, неабходныя для асуджанага і асоб, якія знаходзяцца на яго ўтрыманні, згодна з пералікам, дадзеным у дадатку да гэтага Кодэкса.

Пры канфіскацыі маёмасці дзяржава не адказвае па даўгах і абавязацельствах асуджанага, калі такія ўзніклі пасля прыняцця органамі дазнання, следчымі або судовымі органамі мер па захаванню маёмасці і прытым без згоды гэтых органаў.

Адносна прэтэнзій, якія павінны задавальняцца за кошт канфіскаванай маёмасці, дзяржава адказвае толькі ў межах актыву, прычым адносна чарговасці задавальнення прэтэнзій захоўваюцца правілы, устаноўленыя Грамадзянскім працэсуальным кодэксам Беларускай ССР.

### Артыкул 35. **Пазбаўленне воінскіх і іншых званняў, а таксама ордэнаў, медаляў і ганаровых званняў**

Пры асуджэнні за цяжкае злачынства асоба, якая мае воінскае або спецыяльнае званне, можа быць па прыгавору суда пазбаўлена гэтага звання.

Пры асуджэнні за цяжкае злачынства асобы, якая ўзнагароджана ордэнам ці медалем або мае ганаровае званне, прысвоенае Прэзідыумам Вярхоўнага Савета СССР, Прэзідыумам Вярхоўнага Савета Беларускай ССР або іншай саюзнай, а таксама аўтаномнай рэспублікі, або воінскае ці іншае званне, прысвоенае Прэзідыумам Вярхоўнага Савета СССР, Саветам Міністраў СССР, Саветам Міністраў Беларускай ССР або іншай саюзнай рэспублікі, суд пры вынясенні прыгавору вырашае пытанне аб мэтазгоднасці ўнясення прадстаўлення ў орган, які ўзнагародзіў асуджанага ордэнам ці медалем або прысвоіў яму званне, аб пазбаўленні асуджанага ордэна ці медаля або ганаровага, воінскага ці іншага звання.

## РАЗДЗЕЛ 4

## АБ НАЗНАЧЭННІ ПАКАРАННЯ І АБ ВЫЗВАЛЕННІ АД ПАКАРАННЯ

### Артыкул 36. **Агульныя асновы назначэння пакарання**

Суд назначае пакаранне ў межах, устаноўленых артыкулам закону, які прадугледжвае адказнасць за ўчыненае злачынства, у дакладнай адпаведнасці з палажэннямі Асноў крымінальнага заканадаўства Саюза ССР і саюзных рэспублік і гэтага Кодэкса. Пры назначэнні пакарання суд, кіруючыся сацыялістычнай правасвядомасцю, улічвае характар і ступень грамадскай небяспекі ўчыненага злачынства, асобу вінаватага і акалічнасці справы, якія змякчаюць і абцяжваюць адказнасць.

### Артыкул 37. **Акалічнасці, якія змякчаюць адказнасць**

Пры назначэнні пакарання акалічнасцямі, якія змякчаюць адказнасць, прызнаюцца:

1) прадухіленне вінаватым шкодных вынікаў учыненага злачынства або добраахвотнае пакрыццё нанесенай шкоды ці ліквідацыя нанесенай шкоды;

2) учыненне злачынства з прычыны збегу цяжкіх асабістых або сямейных акалічнасцей;

3) учыненне злачынства пад уплывам пагрозы ці прымусу або з прычыны матэрыяльнай ці іншай залежнасці;

4) учыненне злачынства пад уплывам моцнага душэўнага хвалявання, выкліканага неправамернымі дзеяннямі пацярпеўшага;

5) учыненне злачынства пры абароне ад грамадска небяспечнага замаху, хоць і з перавышэннем межаў неабходнай абароны;

6) учыненне злачынства непаўналетнім;

7) учыненне злачынства жанчынай у стане цяжарнасці;

8) чыстасардэчнае раскаянне або яўка з пакаяннем;

9) актыўнае садзейнічанне раскрыццю злачынства.

Пры назначэнні пакарання суд можа ўлічваць таксама змякчаючыя акалічнасці, не ўказаныя ў законе.

### Артыкул 38. **Акалічнасці, якія абцяжваюць адказнасць**

Пры назначэнні пакарання акалічнасцямі, якія абцяжваюць адказнасць, прызнаюцца:

1) учыненне злачынства асобай, якая раней зрабіла якоенебудзь злачынства.

Суд мае права, у залежнасці ад характару першага злачынства, не прызнаць за ім значэння абцяжваючай акалічнасці;

2) учыненне злачынства арганізаванай групай;

3) учыненне злачынства з карыслівых або іншых нізкіх пабуджэнняў;

4) прычыненне злачынствам цяжкіх вынікаў;

5) учыненне злачынства ў адносінах да малалетняга, састарэлага або асобы, якая знаходзіцца ў бездапаможным стане, а таксама ў адносінах да асобы, якая знаходзіцца ў матэрыяльнай або іншай залежнасці ад вінаватага;

6) падбухторванне непаўналетніх да ўчынення злачынства або прыцягненне непаўналетніх да ўдзелу ў злачынстве;

7) учыненне злачынства з асаблівай жорсткасцю або здзекам з пацярпеўшага;

8) учыненне злачынства з выкарыстаннем умоў грамадскага бедства;

9) учыненне злачынства агульнанебяспечным спосабам;

10) учыненне злачынства, звязанага з выкарыстаннем крыніцы павышанай небяспекі, асобай, якая знаходзіцца ў стане ап'янення;

11) учыненне новага злачынства асобай, якая была ўзята на парукі, на працягу тэрміну паручыцельства або на працягу аднаго года пасля заканчэння гэтага тэрміну.

Артыкул 39. **Назначэнне пакарання пры ўчыненні некалькіх злачынстваў**

Калі асоба прызнана вінаватай ва ўчыненні двух або больш злачынстваў, прадугледжаных рознымі артыкуламі гэтага Кодэкса, ні за адно з якіх яна не была асуджана, суд, назначыўшы пакаранне асобна за кожнае злачынства, канчаткова вызначае пакаранне па іх сукупнасці шляхам паглынання менш строгага пакарання больш строгім або шляхам поўнага ці частковага складання назначаных пакаранняў у межах, устаноўленых артыкулам гэтага Кодэкса, які прадугледжвае больш строгае пакаранне.

Да асноўнага пакарання можа быць далучана любое з дадатковых пакаранняў, прадугледжаных артыкуламі гэтага Кодэкса, якія ўстанаўліваюць адказнасць за тыя злачынствы, ва ўчыненні якіх асоба была прызнана вінаватай.

Паводле тых жа правіл назначаецца пакаранне, калі пасля вынясення прыгавору па справе будзе ўстаноўлена, што асуджаны вінаваты яшчэ і ў другім злачынстве, зробленым ім да вынясення прыгавору па першай справе. У гэтым выпадку

ў тэрмін пакарання залічваецца пакаранне, адбытае поўнасцю або часткова па першаму прыгавору.

Артыкул 40. **Назначэнне пакарання па некалькіх прыгаворах**

Калі асуджаны пасля вынясення прыгавору, але да поўнага адбыцця пакарання ўчыніў новае злачынства, суд да пакарання, назначанага па новаму прыгавору, поўнасцю або часткова далучае неадбытую частку пакарання па папярэдняму прыгавору.

Пры складанні пакаранняў у парадку, прадугледжаным гэтым артыкулам, агульны тэрмін пакарання не павінен перавышаць максімальнага тэрміну, устаноўленага для данага віду пакарання. Пры складанні пакаранняў у выглядзе пазбаўлення волі агульны тэрмін пакарання не павінен перавышаць дзесяці год, а за злачынствы, па якіх законам допускаецца назначэнне пазбаўлення волі на тэрмін больш як дзесяць год, не павінен перавышаць пятнаццаці год.

Пры складанні пакаранняў у выглядзе пазбаўлення волі і ўтрымання ў дысцыплінарным батальёне аднаму дню пазбаўлення волі адпавядае адзін дзень утрымання ў дысцыплінарным батальёне.

Пры складанні пакаранняў у выглядзе пазбаўлення волі і пакаранняў у выглядзе ссылкі, высылкі або папраўчых работ аднаму дню пазбаўлення волі адпавядаюць тры дні ссылкі, высылкі або папраўчых работ.

Прыгаворы, па якіх асобы асуджаны да пазбаўлення волі і штрафу, а таксама да папраўчых работ і штрафу, прыводзяцца ў выкананне самастойна.

Артыкул 41. **Аб парадку вызначэння тэрмінаў пакарання**

Тэрміны пазбаўлення волі, утрымання ў дысцыплінарным батальёне, ссылкі, высылкі, папраўчых работ, а таксама пазбаўленне права займаць пэўныя пасады або займацца пэўнай дзейнасцю вылічваюцца месяцамі і гадамі, а тэрміны ўтрымання на гаўптвахце — суткамі і месяцамі.

Пры замене або складанні пакаранняў допускаецца вылічэнне ўказаных пакаранняў у днях.

Артыкул 42. **Назначэнне больш мяккага пакарання, чым прадугледжана законам**

Суд, улічваючы выключныя акалічнасці справы і асобу вінаватага і прызнаючы неабходным назначыць яму пакаран-


[library stamp]

не, ніжэйшае за самае нізкае, прадугледжанае законам за данае злачынства, або перайсці да іншага, больш мяккага віду пакарання, можа дапусціць такое змякчэнне з абавязковым указаннем яго матываў.

### Артыкул 43. Умоўнае асуджэнне

Калі пры назначэнні пакарання ў выглядзе пазбаўлення волі або папраўчых работ суд, улічваючы акалічнасці справы і асобу вінаватага, прыйдзе да пераканання аб нямэтазгоднасці адбывання вінаватым назначанага пакарання, ён можа пастанавіць аб умоўным неўжыванні пакарання да вінаватага з абавязковым указаннем у прыгаворы матываў умоўнага асуджэння. У гэтым выпадку суд пастанаўляе не прыводзіць прыгавор у выкананне, калі на працягу вызначанага судом выпрабавальнага тэрміну асуджаны не зробіць новага аднароднага або не менш цяжкага злачынства.

Выпрабавальны тэрмін назначаецца судом працягласцю ад аднаго года да пяці год.

У выпадку ўчынення ўмоўна асуджаным на працягу выпрабавальнага тэрміну новага аднароднага або не менш цяжкага злачынства, суд назначае яму пакаранне па правілах, прадугледжаных артыкулам 40 гэтага Кодэкса.

Пры ўмоўным асуджэнні дадатковыя пакаранні, за выключэннем штрафу, не могуць быць назначаны.

Улічваючы акалічнасці справы, асобу вінаватага, а таксама хадайніцтва грамадскіх арганізацый або калектыву рабочых, служачых, калгаснікаў па месцу работы вінаватага аб яго ўмоўным асуджэнні, суд можа перадаць ім для перавыхавання і выпраўлення ўмоўна асуджанага.

Па хадайніцтву грамадскай арганізацыі або калектыву працоўных па месцу работы ўмоўна асуджанага суд можа скараціць устаноўлены прыгаворам выпрабавальны тэрмін.

Пытанне аб скарачэнні выпрабавальнага тэрміну можа быць пастаўлена пасля сканчэння не менш як палавіны гэтага тэрміну.

Улік умоўна асуджаных і назіранне за іх паводзінамі ажыццяўляе суд, які ўжыў умоўнае асуджэнне.

### Артыкул 44. Адтэрміноўка выканання прыгавору ваеннаслужачаму або ваеннаабавязанаму ў ваенны час

У ваенны час выкананне прыгавору да пазбаўлення волі, вынесенага ў адносінах да ваеннаслужачага або ваеннаабавя-

занага, які падлягае прызыву або мабілізацыі, можа быць судом адтэрмінавана да заканчэння ваенных дзеянняў з накіраваннем асуджанага ў дзеючую армію. Суд можа ў гэтых выпадках адтэрмінаваць выкананне і дадатковых пакаранняў.

Калі асуджаны, накіраваны ў дзеючую армію, праявіць сябе стойкім абаронцам сацыялістычнай Радзімы, то, па хадайніцтву адпаведнага ваеннага камандавання, суд можа вызваліць яго ад пакарання або замяніць пакаранне іншым, больш мяккім.

У выпадку ўчынення асобай, адносна якой выкананне прыгавору было адтэрмінавана, новага злачынства суд далучае да новага пакарання раней назначанае па правілах, прадугледжаных у артыкуле 40 гэтага Кодэкса.

Артыкул 45. **Залік папярэдняга зняволення**

Папярэдняе зняволенне залічваецца судом у тэрмін пакарання пры асуджэнні да пазбаўлення волі і накіравання ў дысцыплінарны батальён дзень за дзень, пры асуджэнні да папраўчых работ, да ссылкі або высылкі — дзень за тры дні.

Пры назначэнні іншых мер пакарання суд, улічваючы папярэдняе зняволенне, можа адпаведна змякчыць назначанае ім пакаранне або поўнасцю вызваліць вінаватага ад адбывання пакарання.

Артыкул 46. **Даўнасць прыцягнення да крымінальнай адказнасці**

Асоба не можа быць прыцягнута да крымінальнай адказнасці, калі з дня ўчынення ёю злачынства прайшлі наступныя тэрміны:

1) адзін год з дня ўчынення злачынства, за якое па закону можа быць назначана пакаранне, не больш строгае, чым папраўчыя работы або накіраванне ў дысцыплінарны батальён;

2) тры гады з дня ўчынення злачынства, за якое па закону могуць быць назначаны пазбаўленне волі на тэрмін не звыш двух год, ссылка або высылка;

3) пяць год з дня ўчынення злачынства, за якое па закону можа быць назначана пазбаўленне волі на тэрмін не звыш пяці год;

4) дзесяць год з дня ўчынення злачынства, за якое па закону можа быць назначана больш строгае пакаранне, чым пазбаўленне волі тэрмінам на пяць год.

Тэрмін даўнасці перапыняецца, калі да сканчэння ўказаных у законе тэрмінаў асоба ўчыніць новае злачынства, за

якое па закону можа быць назначана пазбаўленне волі на тэрмін звыш двух год. Вылічэнне даўнасці ў гэтым выпадку пачынаецца з моманту ўчынення новага злачынства.

Тэрмін даўнасці прыпыняецца, калі асоба, якая ўчыніла злачынства, скрыецца ад следства або суда. У гэтых выпадках тэрмін даўнасці аднаўляецца з моманту затрымання асобы або яўкі яе з пакаяннем. Пры гэтым асоба не можа быць прыцягнута да крымінальнай адказнасці, калі з часу ўчынення злачынства прайшло пятнаццаць год і даўнасць не была перапынена ўчыненнем новага злачынства.

Пытанне аб ужыванні даўнасці да асобы, якая ўчыніла злачынства, за якое па закону можа быць назначана пакаранне смерцю, вырашаецца судом. Калі суд не знойдзе магчымым ужыць даўнасць, пакаранне смерцю не можа быць назначана і замяняецца пазбаўленнем волі.

### Артыкул 47. **Даўнасць выканання абвінаваўчага прыгавору**

Абвінаваўчы прыгавор не прыводзіцца ў выкананне, калі ён не быў прыведзены ў выкананне ў наступныя тэрміны, лічачы з дня ўваходжання прыгавору ў законную сілу:

1) адзін год — пры асуджэнні да пакарання, не больш строгага, чым папраўчыя работы або накіраванне ў дысцыплінарны батальён;

2) тры гады — пры асуджэнні да пазбаўлення волі на тэрмін не звыш двух год, да ссылкі або высылкі;

3) пяць год — пры асуджэнні да пазбаўлення волі на тэрмін не звыш пяці год;

4) дзесяць год — пры асуджэнні да больш строгага пакарання, чым пазбаўленне волі тэрмінам на пяць год.

Тэрмін даўнасці перапыняецца, калі асуджаны ўхіліцца ад адбывання пакарання або ўчыніць да сканчэння тэрмінаў новае злачынства, за якое судом назначана пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі на тэрмін не менш аднаго года, ссылкі або высылкі на тэрмін не менш трох год. Вылічэнне даўнасці ў выпадку ўчынення новага злачынства пачынаецца з моманту яго ўчынення, а ў выпадку ўхілення ад адбывання пакарання — з моманту яўкі для адбыцця пакарання або з моманту затрымання асуджанага, які хаваўся. Пры гэтым абвінаваўчы прыгавор не можа быць прыведзены ў выкананне, калі з часу яго вынясення прайшло пятнаццаць год і даўнасць не была перапынена ўчыненнем новага злачынства.

Пытанне аб ужыванні даўнасці да асобы, прыгаворанай да

пакарання смерцю, вырашаецца судом. Калі суд не палічыць магчымым ужыць даўнасць, пакаранне смерцю замяняецца пазбаўленнем волі.

**Артыкул 48. Вызваленне ад крымінальнай адказнасці і пакарання**

Асоба, якая ўчыніла злачынства, можа быць вызвалена ад крымінальнай адказнасці, калі будзе прызнана, што да часу расследавання або разгляду справы ў судзе, з прычыны змянення абстаноўкі, учыненае вінаватым дзеянне страціла характар грамадска небяспечнага або гэтая асоба перастала быць грамадска небяспечнай.

Асоба, якая ўчыніла злачынства, можа быць вызвалена ад пакарання, калі будзе прызнана, што з прычыны далейшых бездакорных паводзін і сумленных адносін да працы гэтая асоба да часу разгляду справы ў судзе не можа быць палічана грамадска небяспечнай.

**Артыкул 49. Вызваленне ад крымінальнай адказнасці з перадачай справы ў таварыскі суд**

Асоба можа быць вызвалена ад крымінальнай адказнасці з перадачай справы на разгляд таварыскага суда, калі яна ўчыніла ўпершыню якое-небудзь з наступных дзеянняў, прадугледжаных гэтым Кодэксам:

1) наўмыснае лёгкае цялеснае пашкоджанне або пабоі (артыкул 110, частка другая), паклёп (артыкул 128, частка першая), знявагу (артыкул 129);

2) іншае дзеянне, за якое, згодна з артыкулам гэтага Кодэкса, дапускаецца прымяненне мер грамадскага ўздзеяння;

3) іншае малазначнае злачынства, калі па характару ўчыненага дзеяння і асобы вінаватага ён можа быць выпраўлены без прымянення пакарання з дапамогай мер грамадскага ўздзеяння.

**Артыкул 50. Вызваленне ад крымінальнай адказнасці з перадачай вінаватага на парукі**

Калі па акалічнасцях справы ўчыненае асобай злачынства і сама гэтая асоба не прадстаўляюць вялікай грамадскай небяспекі і калі дзеянне вінаватага не выклікала цяжкіх вынікаў, а сам ён чыстасардэчна раскаяўся, то, па хадайніцтву грамадскай арганізацыі або калектыву працоўных, гэтая асоба можа быць вызвалена ад крымінальнай адказнасці і перададзена на парукі для перавыхавання і выпраўлення той грамадскай

арганізацыі або таму калектыву працоўных, якія ўзбудзілі хадайніцтва.

На парукі не можа быць перададзена асоба, якая раней была асуджана за ўчыненне наўмыснага злачынства або перадавалася ўжо на парукі.

Не можа быць перададзена на парукі таксама асоба, якая не лічыць сябе вінаватай або па якіх-небудзь прычынах настойвае на разглядзе справы ў судзе.

Калі асоба, узятая на парукі, на працягу года не апраўдала давер'я калектыву, парушыла абяцанне прыкладнымі паводзінамі і сумленнай працай даказаць сваё выпраўленне, не падпарадкоўваецца нормам сацыялістычнага супольнага жыцця або пакінула працоўны калектыў з мэтай ухіліцца ад грамадскага ўздзеяння, то грамадская арганізацыя або калектыў працоўных, якія ўзялі яе на парукі, выносяць рашэнне аб адмове ад паручыцельства і накіроўваюць гэтае рашэнне ў пракуратуру або суд для разгляду пытання аб прыцягненні вінаватага да крымінальнай адказнасці за тое злачынства, у сувязі з учыненнем якога ён быў перададзены на парукі.

Артыкул 51. **Умоўна-датэрміновае вызваленне ад пакарання і замена пакарання больш мяккім**

Калі асуджаны да пазбаўлення волі, папраўчых работ, ссылкі, высылкі або накіравання ў дысцыплінарны батальён прыкладнымі паводзінамі і сумленнымі адносінамі да працы даказаў сваё выпраўленне, да яго можа быць ужыта судом, пасля фактычнага адбыцця не менш як палавіны назначанага тэрміну пакарання, умоўна-датэрміновае вызваленне ад пакарання або замена неадбытай часткі пакарання больш мяккім пакараннем. Пры гэтым асуджаны можа быць вызвалены таксама ад дадатковых пакаранняў у выглядзе ссылкі, высылкі або пазбаўлення права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю.

Да асоб, асуджаных за асабліва небяспечныя дзяржаўныя злачынствы (артыкулы 61—70), бандытызм (артыкул 74), масавыя беспарадкі (артыкул 76), пашкоджанне шляхоў зносін і транспартных сродкаў (артыкул 83), выраб або збыт фальшывых грошай ці каштоўных папер (артыкул 84), раскраданне дзяржаўнай або грамадскай маёмасці ў вялікіх размерах (артыкулы 87, частка трэцяя, 88, частка трэцяя, 90, частка трэцяя і 91, частка трэцяя), грабеж пры абцяжваючых акалічнасцях (артыкулы 88, частка другая і 142, частка другая), разбой (артыкулы 89 і 143), наўмыснае знішчэнне або па-

шкоджанне пры абцяжваючых акалічнасцях дзяржаўнай або грамадскай ці асабістай маёмасці грамадзян (артыкул 96, частка другая і 146, частка другая), наўмыснае забойства (артыкулы 100 і 101), наўмыснае цяжкае цялеснае пашкоджанне (артыкул 106), згвалтаванне пры абцяжваючых акалічнасцях (артыкул 115, часткі другая і трэцяя), спекуляцыю (артыкулы 85 і 151, частка другая), махлярства (артыкулы 90 і 144, часткі другая і трэцяя), ашуканне пакупнікоў (артыкул 153, частка другая), перавышэнне ўлады або службовых паўнамоцтваў пры абцяжваючых акалічнасцях (артыкул 167, частка другая), атрыманне хабару пры абцяжваючых акалічнасцях (артыкул 169, частка другая), прыцягненне заведама невінаватага да крымінальнай адказнасці (артыкул 172, частка другая), вынясенне заведама неправасуднага прыгавору, рашэння, вызначэння або пастановы, выклікаўшае цяжкія вынікі (артыкул 173, частка другая), прымушэнне да дачы паказанняў пры абцяжваючых акалічнасцях (артыкул 175, частка другая), злоснае хуліганства (артыкул 201, частка другая), непадпарадкаванне (артыкул 227, пункты «б» і «в»), супраціўленне начальніку або прымушэнне яго да парушэння службовых абавязкаў (артыкул 229, пункты «б» і «в»), насільныя дзеянні ў адносінах да начальніка (артыкул 231), умоўна-датэрміновае вызваленне і замена неадбытай часткі пакарання больш мяккім пакараннем могуць быць ужыты пасля фактычнага адбыцця не менш як дзвюх трэцей назначанага тэрміну пакарання.

У выпадку ўчынення асобай, да якой было ўжыта ўмоўна-датэрміновае вызваленне, на працягу неадбытай часткі пакарання новага аднароднага або не менш цяжкага злачынства, суд назначае ёй пакаранне па правілах, прадугледжаных артыкулам 40 гэтага Кодэкса.

Умоўна-датэрміновае вызваленне і замена неадбытай часткі пакарання больш мяккім пакараннем да асабліва небяспечных рэцыдывістаў не ўжываюцца.

Артыкул 52. **Вызваленне ад пакарання і замена пакарання больш мяккім у адносінах да асоб, якія ўчынілі злачынствы ва ўзросце да васемнаццаці год**

Калі асуджаны да пазбаўлення волі або да папраўчых работ за злачынства, учыненае ва ўзросце да васемнаццаці год, прыкладнымі паводзінамі і сумленнымі адносінамі да працы і навучання даказаў сваё выпраўленне, да яго могуць быць

ужыты судом пасля фактычнага адбыцця не менш як адной трэці тэрміну пакарання:

1) умоўна-датэрміновае вызваленне ад пакарання, калі вызваленне ад пакарання ўжываецца пасля дасягнення асуджаным васемнаццацігадовага ўзросту, або

2) датэрміновае вызваленне ад пакарання, калі вызваленне ад пакарання ўжываецца да дасягнення асуджаным васемнаццацігадовага ўзросту, або

3) замена неадбытай часткі пакарання больш мяккім.

Артыкул 53. **Вызваленне ад адбывання пакарання**

Вызваленне асуджанага ад адбывання пакарання, а таксама змякчэнне назначанага пакарання, апрача вызвалення ад пакарання або змякчэння пакарання ў парадку амністыі і памілавання, можа ўжывацца толькі судом у выпадках і ў парадку, указаных у законе.

Артыкул 54. **Пагашэнне судзімасці**

Не маючымі судзімасці прызнаюцца:

1) асобы, вызваленыя ад пакарання на падставе артыкулаў 47 і 48 гэтага Кодэкса;

2) асобы, якія адбылі пакаранне ў дысцыплінарным батальёне або датэрмінова вызваленыя з яго, а таксама ваеннаслужачыя, адбыўшыя пакаранне ў выглядзе ўтрымання на гаўптвахце ўзамен папраўчых работ;

3) асобы, умоўна асуджаныя, калі на працягу выпрабавальнага тэрміну яны не ўчыняць новага злачынства;

4) асобы, асуджаныя да грамадскага ганьбавання, звальнення з пасады, штрафу, пазбаўлення права займаць пэўныя пасады або займацца пэўнай дзейнасцю або да папраўчых работ, калі на працягу аднаго года з дня адбыцця пакарання яны не ўчыняць новага злачынства;

5) асобы, асуджаныя да пазбаўлення волі на тэрмін не больш трох год, ссылкі або высылкі, калі яны на працягу трох год з дня адбыцця пакарання (асноўнага і дадатковага) не ўчыняць новага злачынства;

6) асобы, асуджаныя да пазбаўлення волі на тэрмін больш трох год, але не звыш шасці год, калі яны на працягу пяці год з дня адбыцця пакарання (асноўнага і дадатковага) не ўчыняць новага злачынства;

7) асобы, асуджаныя да пазбаўлення волі на тэрмін больш шасці год, але не звыш дзесяці год, калі яны на пра-

цягу васьмі год з дня адбыцця пакарання (асноўнага і дадатковага) не ўчыняць новага злачынства;

8) асобы, асуджаныя да пазбаўлення волі на тэрмін звыш дзесяці год, калі яны на працягу васьмі год з дня адбыцця пакарання (асноўнага і дадатковага) не ўчыняць новага злачынства і калі пры гэтым судом будзе ўстаноўлена, што асуджаны выправіўся і няма неабходнасці лічыць яго маючым судзімасць.

Калі асуджаны да пазбаўлення волі пасля адбыцця ім пакарання прыкладнымі паводзінамі і сумленнымі адносінамі да працы даказаў сваё выпраўленне, то, па хадайніцтву грамадскіх арганізацый, суд можа зняць з яго судзімасць да сканчэння ўказаных у гэтым артыкуле тэрмінаў.

Калі назначанае прыгаворам суда пакаранне скарочана ці заменена больш мяккім з прычыны акту амністыі або памілавання ці ўжывання ўмоўна-датэрміновага або датэрміновага вызвалення, тэрмін пагашэння судзімасці вылічваецца зыходзячы с фактычна адбытага тэрміну пакарання.

Тэрмін пагашэння судзімасці вылічваецца з дня адбыцця пакарання або вызвалення ад яго.

## РАЗДЗЕЛ 5

## АБ ПРЫМУСОВЫХ МЕРАХ МЕДЫЦЫНСКАГА І ВЫХАВАЎЧАГА ХАРАКТАРУ

### Артыкул 55. Прымусовыя меры медыцынскага характару, якія ўжываюцца да псіхічнахворых

Да асоб, якія ўчынілі грамадска небяспечныя дзеянні ў стане поўнай адсутнасці памяці або ўчынілі такія дзеянні ў стане поўнай прысутнасці памяці, але захварэлі да вынясення прыгавору ці ў час адбывання пакарання псіхічнай хваробай, якая пазбаўляе іх магчымасці ўсведамляць свае дзеянні або кіраваць імі, судом могуць быць ужыты наступныя прымусовыя меры медыцынскага характару:

1) змяшчэнне ў псіхіятрычную бальніцу агульнага тыпу;

2) змяшчэнне ў псіхіятрычную бальніцу спецыяльнага тыпу.

### Артыкул 56. Змяшчэнне ў псіхіятрычную бальніцу

Прымусовае лячэнне ў псіхіятрычнай бальніцы агульнага тыпу можа быць ужыта судом у адносінах да псіхічнахвора-

га, які па свайму псіхічнаму стану і характару ўчыненага грамадска небяспечнага дзеяння мае патрэбу ў бальнічным утрыманні і лячэнні ў прымусовым парадку.

Змяшчэнне ў псіхіятрычную бальніцу спецыяльнага тыпу можа быць назначана судом у адносінах да псіхічнахворага, які з'яўляецца па свайму псіхічнаму стану і характару ўчыненага ім грамадска небяспечнага дзеяння асабліва небяспечным для грамадства.

Асобы, змешчаныя ў псіхіятрычную бальніцу спецыяльнага тыпу, утрымліваюцца ва ўмовах узмоцненага нагляду, які выключае магчымасць учынення імі новага грамадска небяспечнага дзеяння.

Артыкул 57. **Назначэнне, змяненне і спыненне ўжывання да псіхічнахворых прымусовых мер медыцынскага характару**

Суд, прызнаўшы неабходным назначыць прымусовую меру медыцынскага характару, выбірае яе від у залежнасці ад псіхічнага захворвання асобы, характару і ступені грамадскай небяспекі ўчыненага ім дзеяння.

Спыненне ўжывання прымусовых мер медыцынскага характару праводзіцца судом па заключэнню лячэбнай установы ў выпадку выздараўлення асобы або такога змянення характару захворвання, пры якім адпадае патрэба ва ўжыванні гэтых мер.

Змяненне віду прымусовай меры медыцынскага характару таксама праводзіцца судом па заключэнню лячэбнай установы.

Калі суд не палічыць неабходным ужыванне да псіхічнахворага прымусовых мер медыцынскага характару, а таксама ў выпадку спынення ўжывання такіх мер, суд можа перадаць яго на папячэнне сваякам ці апекунам пры абавязковым урачэбным назіранні.

Артыкул 58. **Залік часу ўжывання прымусовых мер медыцынскага характару**

Да асобы, якая пасля ўчынення злачынства або ў час адбывання пакарання захварэла псіхічнай хваробай, пазбаўляючай яе магчымасці ўсведамляць свае дзеянні або кіраваць імі, пасля яе выздараўлення судом можа быць ужыта пакаранне, калі не прайшлі тэрміны даўнасці або няма іншых падстаў для вызвалення ад крымінальнай адказнасці і пакарання.

Калі да такой асобы пасля выздараўлення ўжываецца пакаранне, то час, на працягу якога ўжываліся прымусовыя меры медыцынскага характару, залічваецца ў тэрмін пакарання па правілах артыкула 45 гэтага Кодэкса.

Артыкул 59. **Прымусовыя меры медыцынскага характару, якія ўжываюцца да алкаголікаў і наркаманаў**

У выпадку ўчынення злачынства алкаголікам ці наркаманам суд, па хадайніцтву грамадскай арганізацыі, калектыву працоўных, таварыскага суда або органа аховы здароўя, побач з пакараннем за ўчыненае злачынства, можа ўжыць да такой асобы прымусовае лячэнне.

Указаныя асобы, асуджаныя да мер пакарання, не звязаных з пазбаўленнем волі, падлягаюць прымусоваму лячэнню ў медыцынскіх установах са спецыяльным лячэннем і працоўным рэжымам.

У выпадку асуджэння такіх асоб да пазбаўлення волі яны падлягаюць прымусоваму лячэнню ў час адбывання пакарання, а пасля вызвалення з месца пазбаўлення волі, у выпадку неабходнасці прадоўжання такога лячэння,— у медыцынскіх установах са спецыяльным лячэннем і працоўным рэжымам.

Спыненне прымусовага лячэння праводзіцца судом па прадстаўленню лячэбнай установы, у якой асоба знаходзіцца на вылячэнні.

У выпадку ўчынення злачынства асобай, якая злоўжывае спіртнымі напіткамі і ставіць у сувязі з гэтым сваю сям'ю ў цяжкае матэрыяльнае становішча, суд, побач з ужываннем пакарання, не звязанага з пазбаўленнем волі, мае права, па хадайніцтву грамадскай арганізацыі, калектыву працоўных або таварыскага суда, вынесці пастанову аб устанаўленні над ёй папячэння.

Артыкул 60. **Прымусовыя меры выхаваўчага характару, якія ўжываюцца ў адносінах да непаўналетніх**

Калі суд у адпаведнасці з часткай трэцяй артыкула 10 гэтага Кодэкса знойдзе мэтазгодным не ўжываць крымінальнае пакаранне да непаўналетняга, які ўчыніў злачынства, ён можа назначыць наступныя прымусовыя меры выхаваўчага характару:

1) ускладанне абавязку публічна або ў іншай форме папрасіць прабачэння ў пацярпеўшага;

2) ускладанне на непаўналетняга, які дасягнуў пятнаццаці год, абавязку пакрыць нанесеную шкоду, калі непаўналетні мае самастойны заработак і сума шкоды не перавышае дваццаці рублёў, або ўскладанне абавязку сваёй працай ліквідаваць нанесеную матэрыяльную шкоду, якая не перавышае дваццаці рублёў;

3) перадача непаўналетняга пад строгі нагляд бацькоў або асоб, якія іх замяняюць;

4) перадача непаўналетняга на парукі або пад назіранне калектыву працоўных ці грамадскай арганізацыі;

5) змяшчэнне ў спецыяльныя лячэбна-выхаваўчыя і выхаваўчыя ўстановы для дзяцей і падлеткаў.

Тэрмін, парадак і ўмовы знаходжання непаўналетніх у спецыяльных лячэбна-выхаваўчых і выхаваўчых установах вызначаюцца Палажэннем аб камісіях па справах непаўналетніх.

# АСАБЛІВАЯ ЧАСТКА

## РАЗДЗЕЛ 6

## ДЗЯРЖАЎНЫЯ ЗЛАЧЫНСТВЫ

### I. Асабліва небяспечныя дзяржаўныя злачынствы

**Артыкул 61. Здрада радзіме**

Здрада радзіме, гэта значыць дзеянне, наўмысна ўчыненае грамадзянінам СССР на шкоду дзяржаўнай незалежнасці, тэрытарыяльнай недатыкальнасці або ваеннай магутнасці СССР: пераход на бок ворага, шпіянаж, выдача дзяржаўнай або ваеннай тайны замежнай дзяржаве, уцёкі за граніцу ці адмова вярнуцца з-за граніцы ў СССР, аказанне замежнай дзяржаве дапамогі ў правядзенні варожай дзейнасці супраць СССР, а таксама змова з мэтай захопу ўлады,—

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад дзесяці да пятнаццаці год з канфіскацыяй маёмасці або смерцю з канфіскацыяй маёмасці.

Не нясе крымінальнай адказнасці грамадзянін СССР, завербаваны замежнай разведкай для правядзення варожай дзейнасці супраць СССР, калі ён для выканання атрыманага злачыннага задання ніякіх дзеянняў не ўчыніў і добраахвотна заявіў органам улады аб сваёй сувязі з замежнай разведкай.

Артыкул 62. **Шпіянаж**

Перадача, а таксама раскраданне або збіранне з мэтай перадачы замежнай дзяржаве, замежнай арганізацыі ці іх агентуры звестак, якія з'яўляюцца дзяржаўнай або ваеннай тайнай, а таксама перадача або збіранне па заданню замежнай разведкі іншых звестак для выкарыстання іх на шкоду інтарэсам СССР, калі шпіянаж учынен іншаземцам або асобай без грамадзянства,—

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад сямі да пятнаццаці год з канфіскацыяй маёмасці або смерцю з канфіскацыяй маёмасці.

Артыкул 63. **Тэрарыстычны акт**

Забойства дзяржаўнага або грамадскага дзеяча ці прадстаўніка ўлады, учыненае ў сувязі з яго дзяржаўнай або грамадскай дзейнасцю, з мэтай падрыву ці аслаблення Савецкай улады,—

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад дзесяці да пятнаццаці год з канфіскацыяй маёмасці або смерцю з канфіскацыяй маёмасці.

Цяжкае цялеснае пашкоджанне, нанесенае з той жа мэтай дзяржаўнаму або грамадскаму дзеячу ці прадстаўніку ўлады ў сувязі з яго дзяржаўнай або грамадскай дзейнасцю,—

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад васьмі да пятнаццаці год з канфіскацыяй маёмасці.

Артыкул 64. **Тэрарыстычны акт супраць прадстаўніка замежнай дзяржавы**

Забойства прадстаўніка замежнай дзяржавы з мэтай правакацыі вайны або міжнародных ускладненняў —

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад дзесяці да пятнаццаці год з канфіскацыяй маёмасці або смерцю з канфіскацыяй маёмасці.

Цяжкае цялеснае пашкоджанне, нанесенае тым жа асобам з той жа мэтай,—

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад васьмі да пятнаццаці год з канфіскацыяй маёмасці.

Артыкул 65. **Дыверсія**

Разбурэнне або пашкоджанне выбухам, падпалам ці іншым спосабам прадпрыемстваў, збудаванняў, пуцей і сродкаў зносін, сродкаў сувязі або іншай дзяржаўнай ці грамадскай маёмасці, учыненне масавых атручванняў або распаўсюджван-

не эпідэмій і эпізаотый з мэтай аслаблення Савецкай дзяржавы —

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад васьмі да пятнаццаці год з канфіскацыяй маёмасці або смерцю з канфіскацыяй маёмасці.

Артыкул 66. **Шкодніцтва**

Дзеянне або бяздзейнасць, накіраванае да падрыву прамысловасці, транспарту, сельскай гаспадаркі, грашовай сістэмы, гандлю ці іншых галін народнай гаспадаркі, а таксама дзейнасці дзяржаўных органаў або грамадскіх арганізацый з мэтай аслаблення Савецкай дзяржавы, калі гэтае дзеянне ўчынена шляхам выкарыстання дзяржаўных ці грамадскіх устаноў, прадпрыемстваў, арганізацый або шляхам працідзеяння іх нармальнай рабоце, —

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад васьмі да пятнаццаці год з канфіскацыяй маёмасці.

Артыкул 67. **Антысавецкая агітацыя і прапаганда**

Агітацыя або прапаганда, праводзімая з мэтай падрыву ці аслаблення Савецкай улады або ўчынення асобных асабліва небяспечных дзяржаўных злачынстваў, распаўсюджванне ў тых жа мэтах паклёпніцкіх выдумак, якія ганьбяць савецкі дзяржаўны і грамадскі лад, а таксама распаўсюджванне або выпуск ці хаванне ў тых жа мэтах літаратуры такога ж зместу —

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад шасці месяцаў да сямі год або ссылкай на тэрмін ад двух да пяці год.

Тыя ж дзеянні, учыненыя асобай, раней асуджанай за асабліва небяспечныя дзяржаўныя злачынствы, а таксама ўчыненыя ў ваенны час,—

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад трох да дзесяці год.

Артыкул 68. **Прапаганда вайны**

Прапаганда вайны, у якой бы форме яна ні вялася,—

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад трох да васьмі год.

Артыкул 69. **Арганізацыйная дзейнасць, накіраваная да ўчынення асабліва небяспечных дзяржаўных злачынстваў, а таксама ўдзел у антысавецкай арганізацыі**

Арганізацыйная дзейнасць, накіраваная да падрыхтоўкі ці ўчынення асабліва небяспечных дзяржаўных злачынстваў,

да стварэння арганізацыі, якая мае мэтай учыніць такія злачынствы, а таксама ўдзел у антысавецкай арганізацыі —

караюцца адпаведна па артыкулах 61—68 гэтага Кодэкса.

Артыкул 70. **Асабліва небяспечныя дзяржаўныя злачынствы, учыненыя супраць іншай дзяржавы працоўных**

У сілу міжнароднай салідарнасці працоўных асабліва небяспечныя дзяржаўныя злачынствы, учыненыя супраць іншай дзяржавы працоўных,—

караюцца адпаведна па артыкулах 61—69 гэтага Кодэкса.

## II. Іншыя дзяржаўныя злачынствы

Артыкул 71. **Парушэнне нацыянальнага і расавага раўнапраўя**

Прапаганда або агітацыя з мэтай узбуджэння расавай ці нацыянальнай варожасці або розні, а таксама прамое ці ўскоснае абмежаванне правоў або ўстанаўленне прамых ці ўскосных пераваг грамадзян у залежнасці ад іх расавай або нацыянальнай прыналежнасці —

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад шасці месяцаў да трох год або ссылкай на тэрмін ад двух да пяці год.

Артыкул 72. **Разгалашэнне дзяржаўнай тайны**

Разгалашэнне звестак, што складаюць дзяржаўную тайну, асобай, якой гэтыя звесткі былі даверaны або сталі вядомы па службе ці рабоце, пры адсутнасці прыкмет здрады радзіме або шпіянажу, —

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад двух да пяці год.

Тое ж дзеянне, калі яно выклікала цяжкія вынікі,—

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад пяці да васьмі год.

Артыкул 73. **Страта дакументаў, якія маюць дзяржаўную тайну**

Страта дакументаў, якія маюць дзяржаўную тайну, а таксама прадметаў, звесткі аб якіх складаюць дзяржаўную тайну, асобай, якой яны былі даверaны, калі страта з'явілася выні-

кам парушэння ўстаноўленых правіл абыходжання з указанымі дакументамі ці прадметамі,—

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад аднаго да трох год.

Тое ж дзеянне, калі яно прынесла цяжкія вынікі,—

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад трох да васьмі год.

Артыкул 74. **Бандытызм**

Арганізацыя ўзброеных банд з мэтай нападу на дзяржаўныя, грамадскія ўстановы ці прадпрыемствы або на паасобных людзей, а таксама ўдзел у такіх бандах і ва ўчыняемых імі нападах —

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад трох да пятнаццаці год з канфіскацыяй маёмасці або смерцю з канфіскацыяй маёмасці.

Артыкул 75. **Кантрабанда**

Кантрабанда, гэта значыць незаконнае перамяшчэнне тавараў або іншых каштоўнасцей праз дзяржаўную граніцу СССР, учыненая з хаваннем прадметаў у спецыяльных сховішчах або з падманным выкарыстаннем таможных і іншых дакументаў, або ў вялікіх размерах, або групай асоб, якія арганізаваліся для заняцця кантрабандай, або службовай асобай з выкарыстаннем службовага становішча, а таксама кантрабанда выбуховых, наркатычных, моцнадзеючых і ядавітых рэчываў, зброі і воінскай амуніцыі,—

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад трох да дзесяці год з канфіскацыяй маёмасці.

Артыкул 76. **Масавыя беспарадкі**

Арганізацыя масавых беспарадкаў, якія суправаджаліся пагромамі, разбурэннямі, падпаламі і іншымі падобнымі дзеяннямі, а таксама непасрэднае ўчыненне іх удзельнікамі памянёных вышэй злачынстваў або аказанне імі ўзброенага супраціўлення ўладзе —

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад двух да пятнаццаці год.

Артыкул 77. **Ухіленне ад чарговага прызыву на абавязковую ваенную службу**

Ухіленне ад чарговага прызыву на абавязковую ваенную службу —

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад аднаго да трох год.

Тое ж дзеянне, учыненае пры дапамозе нанясення сабе цялеснага пашкоджання або шляхам сімуляцыі хваробы, пры дапамозе падробкі дакументаў ці шляхам іншага падману, а таксама ўчыненае пры іншых абцяжваючых акалічнасцях,—

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад аднаго да пяці год.

Артыкул 78. **Ухіленне ад прызыву па мабілізацыі**

Ухіленне ад прызыву па мабілізацыі ў рады Узброеных Сіл СССР —

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад трох да дзесяці год.

Тое ж дзеянне, а таксама ўхіленне ад далейшых прызываў для ўкамплектавання Узброеных Сіл СССР, учыненыя ў ваенны час,—

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад пяці да дзесяці год або смерцю.

Артыкул 79. **Ухіленне ў ваенны час ад выканання павіннасцей або ўплаты падаткаў**

Ухіленне ў ваенны час ад працоўнай мабілізацыі або выканання іншых павіннасцей, а таксама ад уплаты падаткаў —

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад аднаго да пяці год або папраўчымі работамі на тэрмін ад шасці месяцаў да аднаго года.

Артыкул 80. **Незаконны выезд за граніцу і незаконны ўезд у СССР**

Выезд за граніцу, уезд у СССР або пераход граніцы без устаноўленага пашпарта ці дазволу належных улад —

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад аднаго да трох год.

Дзеянне гэтага артыкула не пашыраецца на выпадкі прыбыцця ў СССР грамадзян замежных дзяржаў без устаноўленага пашпарта або дазволу для выкарыстання права прытулку, дадзенага Канстытуцыяй СССР.

Артыкул 81. **Парушэнне правіл міжнародных палётаў**

Улёт у СССР і вылет з СССР без устаноўленага дазволу, незахаванне ўказаных у дазволе маршрутаў, месц пасадкі,

паветраных варот, вышыні палётаў або іншае парушэнне правіл міжнародных палётаў —

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад аднаго да дзесяці год або штрафам у размеры да адной тысячы рублёў з канфіскацыяй паветранага судна ці без канфіскацыі.

Артыкул 82. **Парушэнне правіл бяспекі руху і эксплуатацыі транспарту**

Парушэнне работнікам чыгуначнага, воднага або паветранага транспарту правіл бяспекі руху і эксплуатацыі транспарту, якое выклікала няшчасныя выпадкі з людзьмі, крушэнне, аварыю або іншыя цяжкія вынікі, а таксама недабраякасны рамонт транспартных сродкаў, пуцей, сродкаў сігналізацыі і сувязі, які выклікаў тыя ж вынікі,—

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад трох да пятнаццаці год.

Тыя ж дзеянні, калі яны не выклікалі, але заведама стваралі пагрозу наступлення тых жа вынікаў, —

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад аднаго да трох год або папраўчымі работамі на тэрмін да аднаго года.

Артыкул 83. **Пашкоджанне шляхоў зносін і транспартных сродкаў**

Наўмыснае разбурэнне або пашкоджанне шляхоў зносін, збудаванняў на іх, рухомага саставу ці суднаў, сродкаў сувязі ці сігналізацыі, якое выклікала або магло выклікаць крушэнне поезда, аварыю карабля ці парушэнне нармальнай работы транспарту і сувязі,—

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад трох да пятнаццаці год.

Артыкул 84. **Выраб або збыт фальшывых грошай ці цэнных папер**

Выраб з мэтай збыту, а таксама збыт фальшывых дзяржаўных казначэйскіх білетаў, білетаў Дзяржаўнага банка СССР, металічнай манеты, дзяржаўных цэнных папер або замежнай валюты —

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад трох да пятнаццаці год з канфіскацыяй маёмасці.

Артыкул 85. **Парушэнне правіл аб валютных аперацыях**

Парушэнне правіл аб валютных аперацыях, а таксама спекуляцыя валютнымі каштоўнасцямі або цэннымі паперамі —

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад трох да васьмі год з канфіскацыяй валютных каштоўнасцей і цэнных папер.

Артыкул 86. **Неданясенне аб дзяржаўных злачынствах**

Неданясенне аб вядомых рыхтуемых або ўчыненых дзяржаўных злачынствах, прадугледжаных артыкуламі 61—66, 69, 74, 84 гэтага Кодэкса,—

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад аднаго да трох год або папраўчымі работамі на тэрмін ад шасці месяцаў да аднаго года.

## РАЗДЗЕЛ 7

## ЗЛАЧЫНСТВЫ СУПРАЦЬ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ УЛАСНАСЦІ

Артыкул 87. **Раскраданне дзяржаўнай або грамадскай маёмасці шляхам крадзяжу**

Тайнае раскраданне дзяржаўнай або грамадскай маёмасці (крадзеж) —

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін да трох год або папраўчымі работамі на тэрмін да аднаго года.

Крадзеж, учынены паўторна або па папярэдняй змове групай асоб,—

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін да шасці год.

Крадзеж, учынены ў вялікіх размерах або асабліва небяспечным рэцыдывістам,—

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад пяці да пятнаццаці год з канфіскацыяй маёмасці або без канфіскацыі.

Заўвага. Паўторным у артыкулах 87, 88, 90 і 91 прызнаецца злачынства, учыненае асобай, якая раней учыніла якое-небудзь са злачынстваў, прадугледжаных гэтымі артыкуламі або артыкуламі 74, 89, 141—144 гэтага Кодэкса.

Артыкул 88. **Раскраданне дзяржаўнай або грамадскай маёмасці шляхам грабяжу**

Адкрытае раскраданне дзяржаўнай або грамадскай маёмасці (грабеж) —

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін да чатырох год або папраўчымі работамі на тэрмін да аднаго года.

Грабеж, звязаны з насіллем, не небяспечным для жыцця

або здароўя пацярпеўшай асобы, або з пагрозай ужывання такога насілля, або ўчынены па папярэдняй змове групай асоб, або паўторна,—

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін да сямі год.

Грабеж, учынены ў вялікіх размерах або асабліва небяспечным рэцыдывістам,—

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад шасці да пятнаццаці год з канфіскацыяй маёмасці або без канфіскацыі.

Артыкул 89. **Разбой з мэтай раскрадання дзяржаўнай або грамадскай маёмасці**

Напад з мэтай заўладання дзяржаўнай або грамадскай маёмасцю, звязаны з насіллем, небяспечным для жыцця ці здароўя асобы, на якую зроблен напад, або з пагрозай ужывання такога насілля (разбой),—

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад трох да дзесяці год з канфіскацыяй маёмасці або без канфіскацыі.

Тыя ж дзеянні, учыненыя па папярэдняй змове групай асоб, або з нанясеннем цяжкіх цялесных пашкоджанняў, або асабліва небяспечным рэцыдывістам, або асобай, якая раней учыніла разбой з мэтай заўладання дзяржаўнай ці грамадскай маёмасцю або асабістай маёмасцю грамадзян, або бандытызм, а таксама, калі гэтыя дзеянні былі накіраваны на заўладанне дзяржаўнай ці грамадскай маёмасцю ў вялікіх размерах,—

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад шасці да пятнаццаці год з канфіскацыяй маёмасці або без канфіскацыі.

Артыкул 90. **Раскраданне дзяржаўнай або грамадскай маёмасці шляхам махлярства**

Заўладанне дзяржаўнай або грамадскай маёмасцю шляхам падману або злоўжывання давер'ем (махлярства) —

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін да трох год або папраўчымі работамі на тэрмін да аднаго года.

Махлярства, учыненае паўторна або па папярэдняй змове групай асоб,—

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін да шасці год.

Махлярства, якое нанесла вялікую шкоду дзяржаве ці грамадскай арганізацыі або ўчынена асабліва небяспечным рэцыдывістам,—

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад пяці да пятнаццаці год з канфіскацыяй маёмасці або без канфіскацыі.

**Артыкул 91. Раскраданне дзяржаўнай або грамадскай маёмасці шляхам прысваення, растраты ці злоўжывання службовым становішчам**

Прысваенне або растрата дзяржаўнай ці грамадскай маёмасці, якая даверана вінаватаму або знаходзілася ў яго веданні, а таксама заўладанне дзяржаўнай ці грамадскай маёмасцю шляхам злоўжывання службовай асобы сваім службовым становішчам —

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін да чатырох год або папраўчымі работамі на тэрмін да аднаго года з пазбаўленнем ці без пазбаўлення права займаць пэўныя пасады або займацца пэўнай дзейнасцю.

Тыя ж дзеянні, учыненыя паўторна або па папярэдняй змове групай асоб,—

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін да сямі год з пазбаўленнем або без пазбаўлення права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю.

Дзеянні, прадугледжаныя часткай першай або другой гэтага артыкула, учыненыя ў вялікіх размерах,—

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад шасці да пятнаццаці год з канфіскацыяй маёмасці або без канфіскацыі і з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады або займацца пэўнай дзейнасцю.

**Артыкул 92. Нанясенне маёмаснай шкоды шляхам падману ці злоўжывання давер'ем**

Нанясенне маёмаснай шкоды дзяржаўнай або грамадскай арганізацыі шляхам падману ці злоўжывання давер'ем пры адсутнасці прыкмет раскрадання —

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін да аднаго года або папраўчымі работамі на той жа тэрмін, або пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю, або звальненнем з пасады, або выклікае прымяненне мер грамадскага ўздзеяння.

**Артыкул 93. Вымаганне дзяржаўнай або грамадскай маёмасці**

Патрабаванне перадачы дзяржаўнай ці грамадскай маёмасці або права на маёмасць пад пагрозай насілля над асобай, у веданні або пад аховай якой знаходзіцца гэтая маёмасць, насілля над яе блізкімі, распаўсюджванне ганьбячых

звестак аб ёй ці яе блізкіх або знішчэння іх маёмасці (вымаганне) —

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін да чатырох год.

Артыкул 94. **Дробнае раскраданне дзяржаўнай або грамадскай маёмасці**

Дробнае раскраданне дзяржаўнай або грамадскай маёмасці шляхам крадзяжу, махлярства, прысваення, растраты ці злоўжывання службовым становішчам, учыненае асобай, якая падвяргалася ўжо мерам грамадскага ўздзеяння за дробны крадзеж або хоць і не падвяргалася такім мерам, але ўчыняла дробны крадзеж больш як два разы, а таксама ўчыненае асобай, да якой па акалічнасцях справы мера грамадскага ўздзеяння не можа быць ужыта,—

караецца папраўчымі работамі на тэрмін да шасці месяцаў.

Дробны крадзеж дзяржаўнай або грамадскай маёмасці, учынены асобай, раней судзімай за такое злачынства або за крадзеж дзяржаўнай ці грамадскай маёмасці, які не з'яўляецца дробным крадзяжом, або раней судзімай за крадзеж, махлярства, грабеж з мэтай заўладання асабістай маёмасцю або разбой з мэтай заўладання дзяржаўнай ці грамадскай або асабістай маёмасцю грамадзян, —

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін да аднаго года або папраўчымі работамі на той жа тэрмін.

Артыкул 95. **Прысваенне знойдзенай дзяржаўнай або грамадскай маёмасці**

Прысваенне знойдзенай, заведама дзяржаўнай або грамадскай каштоўнай маёмасці —

караецца папраўчымі работамі на тэрмін да шасці месяцаў або грамадскім ганьбаваннем, або выклікае прымяненне мер грамадскага ўздзеяння.

Артыкул 96. **Наўмыснае знішчэнне ці пашкоджанне дзяржаўнай або грамадскай маёмасці**

Наўмыснае знішчэнне ці пашкоджанне дзяржаўнай або грамадскай маёмасці —

караецца папраўчымі работамі на тэрмін да аднаго года або штрафам да ста рублёў.

Наўмыснае знішчэнне ці пашкоджанне дзяржаўнай або грамадскай маёмасці, учыненае шляхам падпалу або іншым агульнанебяспечным спосабам або выклікаўшае чалавечыя ахвяры, ці нанёсшае вялікую шкоду або іншыя цяжкія вынікі,

а таксама наўмыснае знішчэнне ці значнае пашкоджанне лясных масіваў шляхам падпалу —

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін да дзесяці год.

Артыкул 97. **Неасцярожнае знішчэнне ці пашкоджанне дзяржаўнай або грамадскай маёмасці**

Неасцярожнае знішчэнне ці пашкоджанне дзяржаўнай або грамадскай маёмасці, якое выклікала чалавечыя ахвяры ці іншыя цяжкія вынікі, а таксама знішчэнне або значнае пашкоджанне лясных масіваў у выніку неасцярожнага абыходжання з агнём або крыніцамі павышанай небяспекі —

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін да трох год або папраўчымі работамі на тэрмін да аднаго года.

Артыкул 98. **Нядобрасумленныя адносіны да аховы дзяржаўнай або грамадскай маёмасці**

Нядобрасумленныя адносіны асобы, якой даручана ахова дзяржаўнай або грамадскай маёмасці, да сваіх абавязкаў, выклікаўшыя раскраданне, пашкоджанне або гібель гэтай маёмасці ў вялікіх размерах, пры адсутнасці прыкмет службовага злачынства, —

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін да двух год або папраўчымі работамі на тэрмін да аднаго года, або выклікаюць прымяненне мер грамадскага ўздзеяння.

Артыкул 99. **Злачынствы супраць дзяржаўнай або грамадскай уласнасці іншых сацыялістычных дзяржаў**

Злачынствы супраць дзяржаўнай або грамадскай уласнасці іншых сацыялістычных дзяржаў, учыненыя ў адносінах да маёмасці, якая знаходзіцца на тэрыторыі Беларускай ССР,—

караюцца адпаведна па артыкулах гэтай главы.

## РАЗДЗЕЛ 8

## ЗЛАЧЫНСТВЫ СУПРАЦЬ ЖЫЦЦЯ, ЗДАРОЎЯ, СВАБОДЫ І ГОДНАСЦІ АСОБЫ

Артыкул 100. **Наўмыснае забойства пры абцяжваючых акалічнасцях**

Наўмыснае забойства:

а) з карыслівай мэтай;

б) з хуліганскіх намераў;

в) у сувязі з выкананнем пацярпеўшым службовага або грамадскага абавязку;

г) дзвюх або больш асоб;

д) жанчыны, якая заведама для вінаватага знаходзілася ў стане цяжарнасці;

е) учыненае з асаблівай жорсткасцю або спосабам, небяспечным для жыцця многіх людзей;

ж) з мэтай утаіць іншае злачынства або аблегчыць яго ўчыненне, а таксама звязанае са згвалтаваннем;

з) учыненае асабліва небяспечным рэцыдывістам або асобай, якая раней учыніла наўмыснае забойства, за выключэннем забойства, прадугледжанага артыкуламі 102 і 103 гэтага Кодэкса,—

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад васьмі да пятнаццаці год з ссылкай ці без ссылкі або смерцю.

Артыкул 101. **Наўмыснае забойства**

Наўмыснае забойства, учыненае без абцяжваючых акалічнасцей, указаных у артыкуле 100 гэтага Кодэкса,—

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін да дзесяці год.

Артыкул 102. **Наўмыснае забойства, учыненае ў стане моцнага душэўнага хвалявання**

Наўмыснае забойства, учыненае ў стане раптоўна ўзнікшага моцнага душэўнага хвалявання, выкліканага насіллем або цяжкай знявагай з боку пацярпеўшага, а таксама выкліканага іншымі процізаконнымі дзеяннямі пацярпеўшага, калі гэтыя дзеянні выклікалі або маглі выклікаць цяжкія вынікі для вінаватага ці яго блізкіх, —

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін да пяці год або папраўчымі работамі на тэрмін да аднаго года.

Артыкул 103. **Забойства пры перавышэнні межаў неабходнай абароны**

Забойства, учыненае пры перавышэнні межаў неабходнай абароны,—

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін да двух год або папраўчымі работамі на тэрмін да аднаго года.

Артыкул 104. **Забойства па неасцярожнасці**

Забойства, учыненае па неасцярожнасці,—

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін да трох год або папраўчымі работамі на тэрмін да аднаго года.

Неасцярожнае забойства дзвюх або больш асоб —
караецца пазбаўленнем волі на тэрмін да пяці год.

Артыкул 105. **Давядзенне да самагубства**

Давядзенне да самагубства або замаху на яго шляхам жорсткага абыходжання з пацярпеўшым або сістэматычнага прыніжэння яго асабістай годнасці —
караецца пазбаўленнем волі на тэрмін да трох год.

Тыя ж дзеянні, учыненыя ў адносінах да асобы, якая знаходзілася ў матэрыяльнай або іншай залежнасці ад вінаватага,—
караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін да пяці год.

Артыкул 106. **Наўмыснае цяжкае цялеснае пашкоджанне**

Наўмыснае цяжкае цялеснае пашкоджанне, небяспечнае для жыцця або выклікаўшае страту зроку, слыху ці якога-небудзь органа або страту органам яго функцый, псіхічную хваробу ці іншае расстройства здароўя, звязанае са стойкай стратай працаздольнасці не менш чым на адну трэць, або выклікаўшае перапыненне цяжарнасці ці выявіўшаеся ў непапраўным знявечанні твару,—
караецца пазбаўленнем волі на тэрмін да васьмі год.

Тыя ж дзеянні, калі яны выклікалі смерць пацярпеўшага, або мелі характар мучэння ці катавання, або былі зроблены асабліва небяспечным рэцыдывістам,—
караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін да дзесяці год.

Артыкул 107. **Наўмыснае менш цяжкае цялеснае пашкоджанне**

Наўмыснае менш цяжкае цялеснае пашкоджанне, не небяспечнае для жыцця і не выклікаўшае вынікаў, указаных у артыкуле 106 гэтага Кодэкса, але выклікаўшае працяглае расстройства здароўя або значную стойкую страту працаздольнасці менш чым на адну трэць,—
караецца пазбаўленнем волі на тэрмін да трох год або папраўчымі работамі на тэрмін да аднаго года.

Тыя ж дзеянні, калі яны мелі характар мучэння ці катавання або былі ўчынены асабліва небяспечным рэцыдывістам,—
караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін да пяці год.

Артыкул 108. **Наўмыснае цяжкае або менш цяжкае цялеснае пашкоджанне, нанесенае ў стане моцнага душэўнага хвалявання**

Наўмыснае цяжкае або менш цяжкае цялеснае пашкоджанне, нанесенае ў стане раптоўна ўзнікшага моцнага душэўнага хвалявання, выклiканага насiллем або цяжкай знявагай з боку пацярпеўшага, а таксама выклiканага iншымi процiзаконнымi дзеяннямi пацярпеўшага, калi гэтыя дзеяннi выклiкалi або маглi выклiкаць цяжкiя вынiкi для вiнаватага цi яго блiзкiх,—

караецца пазбаўленнем волi на тэрмiн да двух год або папраўчымi работамi на тэрмiн да аднаго года.

Артыкул 109. **Цяжкае або менш цяжкае цялеснае пашкоджанне пры перавышэннi межаў неабходнай абароны**

Цяжкае або менш цяжкае цялеснае пашкоджанне, нанесенае пры перавышэннi межаў неабходнай абароны, —

караецца пазбаўленнем волi на тэрмiн да аднаго года або папраўчымi работамi на той жа тэрмiн.

Артыкул 110. **Наўмыснае лёгкае цялеснае пашкоджанне або пабоi**

Наўмыснае нанясенне цялеснага пашкоджання або нанясенне пабояў, выклiкаўшае кароткачасовае расстройства здароўя або нязначную стойкую страту працаздольнасцi,—

караецца пазбаўленнем волi на тэрмiн да аднаго года або папраўчымi работамi на той жа тэрмiн.

Тыя ж дзеяннi, не выклiкаўшыя вынiкаў, указаных у частцы першай гэтага артыкула,—

караюцца пазбаўленнем волi на тэрмiн да шасцi месяцаў, або папраўчымi работамi на той жа тэрмiн, або штрафам да пяцiдзесяцi рублёў, або выклiкаюць прымяненне мер грамадскага ўздзеяння.

Артыкул 111. **Катаванне**

Сiстэматычнае нанясенне пабояў або iншыя дзеяннi, якiя маюць характар катавання, калi яны не выклiкалi вынiкаў, указаных у артыкулах 106 i 107 гэтага Кодэкса, —

караюцца пазбаўленнем волi на тэрмiн да трох год.

Артыкул 112. **Неасцярожнае цяжкае або менш цяжкае цялеснае пашкоджанне**

Неасцярожнае цяжкае цялеснае пашкоджанне —

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін да двух год або папраўчымі работамі на тэрмін да аднаго года.

Неасцярожнае менш цяжкае цялеснае пашкоджанне —

караецца папраўчымі работамі на тэрмін да аднаго года або грамадскім ганьбаваннем.

Артыкул 113. **Заражэнне венерычнай хваробай**

Заражэнне іншай асобы венерычнай хваробай асобай, якая ведала аб наяўнасці ў яе гэтай хваробы,—

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін да двух год або папраўчымі работамі на тэрмін да аднаго года.

Артыкул 114. **Незаконнае правядзенне аборту**

Незаконнае правядзенне аборту ўрачом —

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін да аднаго года або папраўчымі работамі на той жа тэрмін, або пазбаўленнем права займацца ўрачэбнай дзейнасцю.

Правядзенне аборту асобай, якая не мае вышэйшай медыцынскай адукацыі,—

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін да двух год або папраўчымі работамі на тэрмін да аднаго года.

Дзеянні, прадугледжаныя часткамі першай і другой гэтага артыкула, учыненыя неаднаразова або выклікаўшыя смерць пацярпеўшай ці іншыя цяжкія вынікі,—

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін да васьмі год.

Артыкул 115. **Згвалтаванне**

Згвалтаванне, гэта значыць палавыя зносіны з ужываннем фізічнага насілля, пагрозы або з выкарыстаннем бездапаможнага стану пацярпеўшай, —

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад трох да сямі год.

Згвалтаванне непаўналетняй, а таксама згвалтаванне, учыненае групай асоб або асобай, якая раней учыніла такое злачынства,—

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад пяці да дзесяці год.

Згвалтаванне, учыненае асабліва небяспечным рэцыдывістам або выклікаўшае асабліва цяжкія вынікі,—

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад сямі да пятнаццаці год.

Артыкул 116. **Прымушэнне жанчыны да ўступлення ў палавую сувязь**

Прымушэнне жанчыны да ўступлення ў палавую сувязь або да задавальнення палавой страсці ў скажонай форме асобай, у адносінах да якой жанчына з'яўлялася матэрыяльна або па службе залежнай, —

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін да трох год.

Артыкул 117. **Палавыя зносіны з асобай, якая не дасягнула палавой сталасці**

Палавыя зносіны з асобай, якая не дасягнула палавой сталасці,—

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін да трох год.

Тыя ж дзеянні, звязаныя з задавальненнем палавой страсці ў скажоных формах,—

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін да шасці год.

Артыкул 118. **Распусныя дзеянні**

Распусныя дзеянні ў адносінах да непаўналетніх —

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін да трох год.

Артыкул 119. **Мужаложства**

Палавыя зносіны мужчыны з мужчынам (мужаложства) —

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін да пяці год.

Мужаложства, учыненае з ужываннем фізічнага насілля, пагроз ці ў адносінах да непаўналетняга, або з выкарыстаннем залежнага становішча пацярпеўшага,—

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін да васьмі год.

Артыкул 120. **Злоснае ўхіленне ад уплаты аліментаў або ад утрымання дзяцей**

Злоснае ўхіленне бацькоў ад уплаты па рашэнню суда сродкаў на ўтрыманне непаўналетніх дзяцей або ад утрымання паўналетніх, якія знаходзяцца на іх утрыманні, але непрацаздольных дзяцей,—

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін да двух год або ссылкай на тэрмін да трох год, або папраўчымі работамі на тэрмін да аднаго года.

Артыкул 121. **Злоснае ўхіленне ад аказання дапамогі бацькам**

Злоснае ўхіленне ад уплаты па рашэнню суда сродкаў на ўтрыманне непрацаздольных бацькоў —

караецца папраўчымі работамі на тэрмін да аднаго года або выклікае прымяненне мер грамадскага ўздзеяння.

Артыкул 122. **Злоўжыванне апякунскімі абавязкамі**

Выкарыстанне апекі ў карыслівых мэтах або пакіданне падапечных без нагляду і неабходнай дапамогі —

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін да двух год або папраўчымі работамі на тэрмін да аднаго года.

Артыкул 123. **Выкраданне або падмен дзіцяці**

Выкраданне або падмен чужога дзіцяці, зробленыя з карыслівай мэтай або з іншых нізкіх намераў,—

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін да пяці год.

Артыкул 124. **Незаконнае пазбаўленне волі**

Незаконнае пазбаўленне волі —

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін да шасці месяцаў або папраўчымі работамі на той жа тэрмін.

Тое ж дзеянне, якое ўчынена спосабам, небяспечным для жыцця ці здароўя пацярпеўшага, або суправаджалася прычыненнем яму фізічных пакут,—

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін да трох год.

Артыкул 125. **Пакіданне ў небяспецы**

Неаказанне асобе, якая знаходзіцца ў небяспечным для жыцця стане, неабходнай і яўна не церпячай адкладання дапамогі, калі яна заведама магла быць аказана вінаватым без сур'ёзнай небяспекі для сябе або іншых асоб, або непаведамленне належным установам ці асобам аб неабходнасці аказання дапамогі —

караецца папраўчымі работамі на тэрмін да аднаго года або грамадскім ганьбаваннем, або выклікае прымяненне мер грамадскага ўздзеяння.

Заведамае пакіданне без дапамогі асобы, якая знаходзіцца ў небяспечным для жыцця стане і пазбаўлена магчымасці прыняць меры для самазахавання па маленству, старасці, хваробе ці наогул з прычыны сваёй бездапаможнасці ў выпадках, калі вінаваты меў магчымасць аказаць пацярпеўшаму дапамогу і быў абавязаны клапаціцца аб ім або сам паставіў яго ў небяспечны для жыцця стан,—

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін да двух год або папраўчымі работамі на тэрмін да аднаго года.

Артыкул 126. **Неаказанне дапамогі хвораму**

Неаказанне дапамогі хвораму без уважлівых прычын асобай медыцынскага персаналу, якая абавязана згодна з устаноўленымі правіламі аказваць такую дапамогу,—

караецца папраўчымі работамі на тэрмін да аднаго года або штрафам да ста рублёў, або грамадскім ганьбаваннем, або выклікае прымяненне мер грамадскага ўздзеяння.

Тое ж дзеянне, калі яно выклікала ці заведама магло выклікаць смерць хворага або іншыя цяжкія вынікі,—

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін да двух год з пазбаўленнем права займацца прафесіянальнай дзейнасцю на тэрмін да трох год.

Артыкул 127. **Неаказанне капітанам судна дапамогі церпячым бедства**

Неаказанне дапамогі капітанам судна людзям, якія церпяць бедства на рацэ або іншым водным шляху, калі гэтая дапамога магла быць аказана без сур'ёзнай небяспекі для свайго судна, яго экіпажу і пасажыраў,—

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін да двух год або папраўчымі работамі на тэрмін да аднаго года.

Артыкул 128. **Паклёп**

Паклёп, гэта значыць распаўсюджванне заведамаілжывых, ганьбячых іншую асобу, выдумак,—

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін да аднаго года або папраўчымі работамі на той жа тэрмін, або штрафам да пяцідзесяці рублёў, або грамадскім ганьбаваннем, або выклікае прымяненне мер грамадскага ўздзеяння.

Паклёп у друкаваным або іншым спосабам размножаным творы, а таксама ўчынены асобай, раней судзімай за паклёп,—

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін да трох год або папраўчымі работамі на тэрмін да аднаго года.

Паклёп, звязаны з абвінавачаннем ва ўчыненні асабліва небяспечнага дзяржаўнага або іншага цяжкага злачынства, —

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін да пяці год.

Артыкул 129. **Знявага**

Знявага, гэта значыць наўмыснае прыніжэнне гонару і годнасці асобы, выражанае ў непрыстойнай форме,—

караецца папраўчымі работамі на тэрмін да шасці месяцаў або штрафам да пяцідзесяці рублёў, або грамадскім ганьбаваннем, або выклікае прымяненне мер грамадскага ўздзеяння.

Знявага ў друку, а таксама знявага, нанесеная асобай, раней судзімай за знявагу,—

караецца папраўчымі работамі на тэрмін да аднаго года або штрафам да ста рублёў.

## РАЗДЗЕЛ 9

## ЗЛАЧЫНСТВЫ СУПРАЦЬ ПАЛІТЫЧНЫХ, ПРАЦОЎНЫХ, ЖЫЛЛЁВЫХ І ІНШЫХ ПРАВОЎ ГРАМАДЗЯН

### Артыкул 130. **Перашкоджанне ажыццяўленню выбарчага права**

Перашкоджанне шляхам насілля, падману, пагроз або подкупу ажыццяўленню грамадзянінам СССР выбарчага права —

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін да двух год або папраўчымі работамі на тэрмін да аднаго года.

### Артыкул 131. **Падлог выбарчых дакументаў, няправільны падлік галасоў або парушэнне тайны галасавання**

Падлог выбарчых дакументаў або заведама няправільны падлік галасоў, а таксама парушэнне тайны галасавання, учыненыя членам выбарчай камісіі або іншай службовай асобай,—

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін да двух год або папраўчымі работамі на тэрмін да аднаго года.

### Артыкул 132. **Парушэнне недатыкальнасці жылля грамадзян**

Незаконны вобыск, незаконнае высяленне або іншыя незаконныя дзеянні, якія парушаюць недатыкальнасць жылля грамадзян,—

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін да аднаго года або папраўчымі работамі на той жа тэрмін, або штрафам да

пяцідзесяці рублёў, або звальненнем з пасады, або выклікаюць прымяненне мер грамадскага ўздзеяння.

Артыкул 133. **Парушэнне законных правоў прафсаюзаў**

Перашкоджанне законнай дзейнасці прафесіянальных саюзаў і іх органаў —

караецца папраўчымі работамі на тэрмін да аднаго года або штрафам да ста рублёў, або звальненнем з пасады.

Артыкул 134. **Парушэнне заканадаўства аб працы**

Незаконнае звальненне працоўнага з работы з асабістых намераў, невыкананне рашэнняў суда аб аднаўленні на рабоце, а таксама іншае наўмыснае істотнае парушэнне заканадаўства аб працы, учыненае службовай асобай дзяржаўнага або грамадскага прадпрыемства ці ўстановы,—

караецца папраўчымі работамі на тэрмін да аднаго года або звальненнем з пасады.

Артыкул 135. **Парушэнне тайны перапіскі**

Парушэнне тайны перапіскі грамадзян —

караецца папраўчымі работамі на тэрмін да шасці месяцаў або штрафам да трыццаці рублёў, або грамадскім ганьбаваннем, або выклікае прымяненне мер грамадскага ўздзеяння.

Артыкул 136. **Адмова ў прыёме на работу або звальненне цяжарнай жанчыны ці кормячай маці**

Адмова ў прыёме на работу або звальненне з работы жанчыны па матывах яе цяжарнасці, а таксама адмова ў прыёме на работу або звальненне з работы маці, якая корміць грудзьмі, па гэтых матывах —

караецца папраўчымі работамі на тэрмін да аднаго года або звальненнем з пасады.

Артыкул 137. **Парушэнне правіл аховы працы**

Парушэнне службовай асобай правіл па тэхніцы бяспекі, прамысловай санітарыі або іншых правіл аховы працы, калі гэтае парушэнне магло выклікаць няшчасныя выпадкі з людзьмі або іншыя цяжкія вынікі,—

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін да аднаго года або папраўчымі работамі на той жа тэрмін, або штрафам да ста рублёў, або звальненнем з пасады.

Тыя ж парушэнні, якія выклікалі прычыненне цялесных пашкоджанняў ці страту працаздольнасці,—
караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін да трох год або папраўчымі работамі на тэрмін да аднаго года.

Парушэнні, указаныя ў частцы першай гэтага артыкула, якія выклікалі смерць чалавека або прычыненне цяжкіх цялесных пашкоджанняў некалькім асобам,—
караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін да пяці год.

Артыкул 138. **Парушэнне аўтарскіх і вынаходніцкіх правоў**

Выпуск пад сваім імем чужога навуковага, літаратурнага, музычнага ці мастацкага твора або іншае прысваенне аўтарства на такі твор, або незаконнае ўзнаўленне ці распаўсюджванне такога твора, а таксама прымушэнне да сааўтарства —
караецца папраўчымі работамі на тэрмін да аднаго года або штрафам да пяцісот рублёў, або выклікае прымяненне мер грамадскага ўздзеяння.

Абнародаванне вынаходства да заяўкі без згоды вынаходніка, прысваенне аўтарства вынаходства, прымушэнне да сааўтарства на вынаходства, а таксама прысваенне аўтарства на рацыяналізатарскую прапанову —
караецца папраўчымі работамі на тэрмін да аднаго года або штрафам да пяцісот рублёў, або выклікае прымяненне мер грамадскага ўздзеяння.

Артыкул 139. **Парушэнне законаў аб аддзяленні царквы ад дзяржавы і школы ад царквы**

Парушэнне законаў аб аддзяленні царквы ад дзяржавы і школы ад царквы —
караецца папраўчымі работамі на тэрмін да аднаго года або штрафам да пяцідзесяці рублёў.

Артыкул 140. **Перашкоджанне правядзенню рэлігійных абрадаў**

Перашкоджанне правядзенню рэлігійных абрадаў, паколькі яны не парушаюць грамадскага парадку і не суправаджаюцца замахам на правы грамадзян,—
караецца папраўчымі работамі на тэрмін да шасці месяцаў або грамадскім ганьбаваннем.

## РАЗДЗЕЛ 10

## ЗЛАЧЫНСТВЫ СУПРАЦЬ АСАБІСТАЙ УЛАСНАСЦІ ГРАМАДЗЯН

Артыкул 141. **Крадзеж**

Тайнае выкраданне асабістай маёмасці грамадзян (крадзеж) —

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін да двух год або папраўчымі работамі на тэрмін да аднаго года.

Крадзеж, які ўчынен паўторна ці па папярэдняй змове групай асоб, або нанёс значную шкоду пацярпеўшаму,—

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін да пяці год.

Крадзеж, учынены асабліва небяспечным рэцыдывістам,—

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад чатырох да дзесяці год.

Заўвага. Паўторным у артыкулах 141, 142 і 144 прызнаецца злачынства, учыненае асобай, якая раней учыніла якое-небудзь са злачынстваў, прадугледжаных гэтымі артыкуламі або артыкуламі 74, 87—91, 143 гэтага Кодэкса.

Артыкул 142. **Грабеж**

Адкрытае выкраданне асабістай маёмасці грамадзян (грабеж) —

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін да трох год або папраўчымі работамі на тэрмін да аднаго года.

Грабеж, учынены паўторна або па папярэдняй змове групай асоб, або звязаны з насіллем, не небяспечным для жыцця ці здароўя пацярпеўшага, або з пагрозай ужывання такога насілля, або прычыніўшы значную шкоду пацярпеўшаму,—

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад трох да шасці год з высылкай або без высылкі.

Грабеж, учынены асабліва небяспечным рэцыдывістам,—

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад пяці да дзесяці год з высылкай або без высылкі.

Артыкул 143. **Разбой**

Напад з мэтай завалодання асабістай маёмасцю грамадзян, злучаны з насіллем, небяспечным для жыцця ці здароўя, або з пагрозай ужывання такога насілля (разбой),—

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад трох да дзесяці год.

Разбой, учынены па папярэдняй змове групай асоб або асобай, якая раней учыніла разбой з мэтай завалодання дзяр-

жаўнай ці грамадскай маёмасцю або асабістай маёмасцю грамадзян, або бандытызм —

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад пяці да дванаццаці год з ссылкай або без ссылкі, з канфіскацыяй маёмасці або без канфіскацыі.

Разбой, звязаны з нанясеннем цяжкіх цялесных пашкоджанняў або ўчынены асабліва небяспечным рэцыдывістам,—

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад шасці да пятнаццаці год з ссылкай або без ссылкі, з канфіскацыяй маёмасці або без канфіскацыі.

Артыкул 144. **Махлярства**

Заўладанне асабістай маёмасцю грамадзян або набыццё права на маёмасць шляхам падману ці злоўжывання давер'ем (махлярства) —

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін да двух год або папраўчымі работамі на тэрмін да аднаго года.

Махлярства, учыненае паўторна або па папярэдняй змове групай асоб,—

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін да чатырох год.

Махлярства, якое нанесла значную шкоду пацярпеўшаму або ўчынена асабліва небяспечным рэцыдывістам, —

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад трох да дзесяці год.

Артыкул 145. **Вымаганне**

Патрабаванне перадачы асабістай маёмасці грамадзян або права на маёмасць ці ўчынення якіх-небудзь дзеянняў маёмаснага характару пад пагрозай насілля над асобай пацярпеўшага ці яго блізкіх, разгалашэння аб іх звестак, якія пацярпеўшыя жадаюць захаваць у тайне, або знішчэння іх маёмасці (вымаганне) —

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін да трох год або папраўчымі работамі на тэрмін да аднаго года.

Артыкул 146. **Наўмыснае знішчэнне або пашкоджанне асабістай маёмасці грамадзян**

Наўмыснае знішчэнне або пашкоджанне асабістай маёмасці грамадзян, якое нанесла значную шкоду пацярпеўшаму,—

караецца папраўчымі работамі на тэрмін да шасці месяцаў або штрафам да пяцідзесяці рублёў.

Наўмыснае знішчэнне або пашкоджанне асабістай маёмас-

ці грамадзян, учыненае шляхам падпалу або іншым агульнанебяспечным спосабам, або выклікаўшае чалавечыя ахвяры ці іншыя цяжкія вынікі,—

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін да васьмі год.

Артыкул 147. **Неасцярожнае знішчэнне або пашкоджанне асабістай маёмасці грамадзян.**

Знішчэнне або пашкоджанне асабістай маёмасці грамадзян у выніку неасцярожнага абыходжання з агнём, якое выклікала чалавечыя ахвяры або іншыя цяжкія вынікі,—

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін да трох год або папраўчымі работамі на тэрмін да аднаго года.

Артыкул 148. **Злачынствы супраць уласнасці аб'яднанняў, якія не з'яўляюцца сацыялістычнымі арганізацыямі**

Злачынствы супраць уласнасці аб'яднанняў, якія не з'яўляюцца сацыялістычнымі арганізацыямі, учыненыя ў адносінах да маёмасці, што знаходзіцца на тэрыторыі Беларускай ССР,—

караюцца адпаведна па артыкулах гэтай главы.

## РАЗДЗЕЛ II

## ГАСПАДАРЧЫЯ ЗЛАЧЫНСТВЫ

Артыкул 149. **Выпуск недабраякаснай, некамплектнай або нестандартнай прадукцыі**

Неаднаразовы або ў вялікіх размерах выпуск з прамысловага прадпрыемства недабраякаснай, некамплектнай або неадпавядаючай абавязковым стандартам і тэхнічным умовам прадукцыі дырэктарам, галоўным інжынерам або начальнікам аддзела тэхнічнага кантролю, а таксама асобамі, якія займаюць іншыя пасады, але выконваюць абавязкі ўказаных асоб,—

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін да трох год або папраўчымі работамі на тэрмін да аднаго года, або звальненнем з пасады.

Артыкул 150. **Прыватнапрадпрыемніцкая дзейнасць і камерцыйнае пасрэдніцтва**

Прыватнапрадпрыемніцкая дзейнасць з выкарыстаннем дзяржаўных, кааператыўных або іншых грамадскіх форм —

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін да пяці год з канфіскацыяй маёмасці або ссылкай на тэрмін да пяці год з канфіскацыяй маёмасці.

Камерцыйнае пасрэдніцтва, якое ажыццяўляецца прыватнымі асобамі ў выглядзе промыслу або з мэтай нажывы ў вялікіх размерах,—

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін да трох год з канфіскацыяй маёмасці або ссылкай на тэрмін да трох год з канфіскацыяй маёмасці.

Артыкул 151. **Спекуляцыя**

Спекуляцыя, гэта значыць скупка і перапродаж тавараў або іншых прадметаў з мэтай нажывы,—

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін да двух год з канфіскацыяй маёмасці або без канфіскацыі або папраўчымі работамі на тэрмін да аднаго года, або штрафам да трохсот рублёў.

Спекуляцыя ў выглядзе промыслу ці ў вялікіх размерах, або ўчыненая асабліва небяспечным рэцыдывістам —

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад двух да сямі год з канфіскацыяй маёмасці.

Артыкул 152. **Незаконнае карыстанне таварнымі знакамі**

Незаконнае карыстанне чужым таварным знакам —

караецца папраўчымі работамі на тэрмін да шасці месяцаў або штрафам да трохсот рублёў.

Артыкул 153. **Падман пакупнікоў**

Абмерванне, абважванне, перавышэнне ўстаноўленых рознічных цэн, аблічванне або іншы падман пакупнікоў у магазінах і іншых гандлёвых прадпрыемствах або ў прадпрыемствах грамадскага харчавання —

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін да двух год або папраўчымі работамі на тэрмін да аднаго года, або пазбаўленнем права займаць пасады ў гандлёвых прадпрыемствах ці прадпрыемствах грамадскага харчавання.

Тыя ж дзеянні, учыненыя ў вялікіх размерах або асобамі, раней судзімымі за тыя ж злачынствы,—

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад двух да сямі год з канфіскацыяй маёмасці або без канфіскацыі з пазбаўленнем права займаць пасады ў гандлёвых прадпрыемствах ці прадпрыемствах грамадскага харчавання.

Артыкул 154. **Выпуск у продаж недабраякасных, нестандартных і некамплектных тавараў**

Неаднаразовы або ў вялікіх размерах выпуск у продаж у гандлёвых прадпрыемствах заведама недабраякасных, нестандартных або некамплектных тавараў загадчыкам магазіна, базы, склада, секцыі, а таксама таваразнаўцам ці бракёрам —

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін да двух год або папраўчымі работамі на тэрмін да аднаго года, або штрафам да ста рублёў, або пазбаўленнем права займаць указаныя пасады.

Артыкул 155. **Выраб і збыт самагону**

Выраб самагону, а таксама выраб апаратаў для самагонаварэння, калі гэтыя дзеянні ўчынены пасля прымянення да вінаватых мер грамадскага ці адміністрацыйнага ўздзеяння,—

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін да аднаго года або папраўчымі работамі на той жа тэрмін, або штрафам да ста рублёў.

Збыт самагону, а таксама апаратаў для самагонаварэння —

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін да трох год або папраўчымі работамі на тэрмін да аднаго года.

Артыкул 156. **Парушэнне правіл гандлю спіртнымі напіткамі**

Парушэнне правіл гандлю спіртнымі напіткамі, калі гэтыя дзеянні ўчынены пасля прымянення да вінаватых мер грамадскага, дысцыплінарнага ці адміністрацыйнага ўздзеяння,—

караецца папраўчымі работамі на тэрмін да шасці месяцаў, або пазбаўленнем права займаць пасады ў гандлёвых прадпрыемствах і прадпрыемствах грамадскага харчавання, або штрафам да пяцідзесяці рублёў.

Артыкул 157. **Падробка знакаў паштовай аплаты і праязных білетаў**

Падробка паштовых марак ці іншых знакаў паштовай аплаты або міжнародных купонаў-адказаў, а таксама выкарыстанне або выпуск у абарачэнне фальшывых паштовых марак ці іншых знакаў паштовай аплаты або міжнародных купонаў-адказаў —

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін да двух год або папраўчымі работамі на тэрмін да аднаго года.

Выраб або збыт у выглядзе промыслу фальшывых білетаў ці іншых дакументаў на праезд пасажыраў або правоз грузаў —

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін да трох год.

Артыкул 158. **Парушэнне ветэрынарных правіл**

Парушэнне ветэрынарных правіл, выклікаўшае распаўсюджанне заразных хвароб жывёлы або іншыя цяжкія вынікі,—

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін да трох год або папраўчымі работамі на тэрмін да аднаго года.

Артыкул 159. **Парушэнне правіл, устаноўленых для барацьбы з хваробамі і шкоднікамі раслін**

Парушэнне правіл, устаноўленых для барацьбы з хваробамі і шкоднікамі раслін, якое выклікала цяжкія вынікі,—

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін да аднаго года або папраўчымі работамі на той жа тэрмін, або штрафам да ста рублёў.

Артыкул 160. **Заняцце забароненым промыслам**

Заняцце промыслам, адносна якога ёсць спецыяльная забарона,—

караецца папраўчымі работамі на тэрмін да аднаго года або штрафам да ста рублёў.

Тыя ж дзеянні, якія ўчыняюцца ў значных размерах або з выкарыстаннем наёмнай працы,—

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін да чатырох год з канфіскацыяй маёмасці або без канфіскацыі.

Артыкул 161. **Незаконнае заняцце рыбным або іншым водным здабываючым промыслам**

Незаконнае заняцце рыбным або іншым водным здабываючым промыслам у рэках, азёрах, сажалках, вадасховішчах без належнага на тое дазволу або ў забароненым час, або ў недазволеных месцах, або недазволенымі прыладамі, спосабамі і прыёмамі —

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін да аднаго года або папраўчымі работамі на той жа тэрмін, або штрафам да ста рублёў з канфіскацыяй здабытага, прылад лоўлі і плывучых сродкаў з іх снасцямі або без канфіскацыі.

Тыя ж дзеянні, калі яны ўчынены паўторна або звязаны

з лоўляй ці забоем каштоўных парод рыб або водных жывёлін, або з нанясеннем вялікай шкоды,—

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін да чатырох год з канфіскацыяй маёмасці або без канфіскацыі.

Артыкул 162. **Правядзенне лесасплаву або ўзрыўных работ з парушэннем правіл аховы рыбных запасаў**

Правядзенне лесасплаву або ўзрыўных работ з парушэннем правіл, устаноўленых з мэтай аховы рыбных запасаў,—

караецца папраўчымі работамі на тэрмін да шасці месяцаў або штрафам да двухсот рублёў.

Артыкул 163. **Незаконнае паляванне**

Паляванне без належнага на тое дазволу або ў забароненых месцах, або ў забароненыя тэрміны, недазволенымі прыладамі і спосабамі, калі гэтыя дзеянні ўчынены пасля прымянення мер адміністрацыйнага ўздзеяння за такое ж парушэнне,—

караецца папраўчымі работамі на тэрмін да аднаго года або штрафам да двухсот рублёў з канфіскацыяй здабытага і недазволеных прылад палявання.

Паляванне на звяроў і птушак, паляваць на якіх поўнасцю забаронена, або незаконнае паляванне, якое нанесла вялікую шкоду,—

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін да аднаго года або папраўчымі работамі на той жа тэрмін, або штрафам да пяцісот рублёў з канфіскацыяй здабытага і прылад палявання.

Артыкул 164. **Патрава пасеваў**

Наўмысная патрава пасеваў, а таксама наўмыснае пашкоджанне полеахоўных лесанасаджэнняў, пладоваягадных і іншых насаджэнняў, якое нанесла вялікую шкоду калгасу, саўгасу або іншай дзяржаўнай ці грамадскай гаспадарцы,—

караецца папраўчымі работамі на тэрмін да аднаго года або штрафам да ста рублёў.

Артыкул 165. **Незаконная парубка лесу**

Незаконная парубка лесу ў дзяржаўных і калгасных лясах, учыненая пасля прымянення мер грамадскага або адміністрацыйнага ўздзеяння,—

караецца папраўчымі работамі на тэрмін да аднаго года

або штрафам да трохсот рублёў з канфіскацыяй незаконна здабытага.

Незаконная парубка лесу, учыненая ў выглядзе промыслу або хоць бы ўпершыню, але нанёсшая вялікую шкоду,—

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін да трох год або штрафам да пяцісот рублёў з канфіскацыяй незаконна здабытага.

РАЗДЗЕЛ 12

## СЛУЖБОВЫЯ ЗЛАЧЫНСТВЫ

### Артыкул 166. Злоўжыванне ўладай або службовым становішчам

Злоўжыванне ўладай або службовым становішчам, гэта значыць наўмыснае выкарыстанне службовай асобай свайго службовага становішча, насуперак інтарэсам службы, калі яно ўчынена з карыслівай або іншай асабістай зацікаўленасці і нанесла істотную шкоду дзяржаўным або грамадскім інтарэсам ці ахоўваемым законам правам і інтарэсам грамадзян,—

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін да трох год або папраўчымі работамі на тэрмін да аднаго года, або звальненнем з пасады.

Злоўжыванне ўладай або службовым становішчам, калі яно выклікала цяжкія вынікі,—

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін да васьмі год.

Заўвага. Пад службовымі асобамі ў артыкулах гэтай главы разумеюцца асобы, якія пастаянна ці часова ажыццяўляюць функцыі прадстаўнікоў улады, а таксама займаюць пастаянна ці часова ў дзяржаўных або грамадскіх установах, арганізацыях або на прадпрыемствах пасады, звязаныя з выкананнем арганізацыйна-распарадчых ці адміністрацыйна-гаспадарчых абавязкаў, або выконваюць такія абавязкі ва ўказаных установах, арганізацыях і на прадпрыемствах па спецыяльнаму паўнамоцтву.

### Артыкул 167. Перавышэнне ўлады або службовых паўнамоцтваў

Перавышэнне ўлады або службовых паўнамоцтваў, гэта значыць наўмыснае ўчыненне службовай асобай дзеянняў, яўна выходзячых за межы правоў і паўнамоцтваў, дадзеных ёй законам, калі яна нанесла істотную шкоду дзяржаўным ці

грамадскім інтарэсам або ахоўваемым законам правам і інтарэсам грамадзян,—

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін да трох год або папраўчымі работамі на тэрмін да аднаго года, або звальненнем з пасады.

Перавышэнне ўлады або службовых паўнамоцтваў, калі яно суправаджалася насіллем, ужываннем зброі ці пакутлівымі і зневажаючымі асабістую годнасць пацярпеўшага дзеяннямі,—

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін да дзесяці год.

Артыкул 168. **Нядбайнасць**

Невыкананне або неналежнае выкананне службовай асобай сваіх абавязкаў з прычыны неахайных або нядобрасумленных да іх адносін, якое нанесла істотную шкоду дзяржаўным ці грамадскім інтарэсам або ахоўваемым законам правам і інтарэсам грамадзян,—

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін да трох год або папраўчымі работамі на тэрмін да аднаго года, або звальненнем з пасады.

Артыкул 169. **Атрыманне хабару**

Атрыманне службовай асобай асабіста або праз пасрэднікаў у якім бы там ні было выглядзе хабару за выкананне ці невыкананне ў інтарэсах таго, хто дае, якога-небудзь дзеяння, якое службовая асоба павінна была або магла зрабіць з выкарыстаннем свайго службовага становішча,—

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін да пяці год.

Тыя ж дзеянні, учыненыя службовай асобай, якая займала адказнае становішча або раней судзілася за хабарніцтва, або атрымлівала хабар неаднаразова, або звязаныя з вымаганнем хабару,—

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад пяці да дзесяці год з канфіскацыяй маёмасці або без канфіскацыі.

Артыкул 170. **Дача хабару**

Дача хабару або пасрэдніцтва ў хабарніцтве —

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін да трох год або папраўчымі работамі на тэрмін да аднаго года.

Дача хабару або пасрэдніцтва ў хабарніцтве, учыненыя неаднаразова або асобай, якая раней судзілася за хабарніцтва, —

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін да пяці год.

Асоба, якая дала хабар, вызваляецца ад крымінальнай адказнасці, калі ў адносінах да яе мела месца вымаганне хабару або калі яна пасля дачы хабару добраахвотна заявіла аб тым, што здарылася.

Артыкул 171. **Службовы падлог**

Службовы падлог, гэта значыць унясенне службовай асобай у карыслівых мэтах або з іншых асабістых намераў у афіцыяльныя дакументы заведама ілжывых звестак, падробка, падчыстка або паметка іншым чыслом, а таксама складанне і выдача ёю заведама ілжывых дакументаў або ўнясенне ў кнігі заведама ілжывых запісаў —

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін да двух год або папраўчымі работамі на тэрмін да аднаго года, або звальненнем з пасады.

## РАЗДЗЕЛ 13

## ЗЛАЧЫНСТВЫ СУПРАЦЬ ПРАВАСУДДЗЯ

Артыкул 172. **Прыцягненне заведама невінаватага да крымінальнай адказнасці**

Прыцягненне заведама невінаватага да крымінальнай адказнасці асобай, якая праводзіць дазнанне, следчым або пракурорам —

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін да трох год.

Тыя ж дзеянні, звязаныя з абвінавачаннем у асабліва небяспечным дзяржаўным ці іншым цяжкім злачынстве, або са штучным стварэннем доказаў абвінавачання,—

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад трох да дзесяці год.

Артыкул 173. **Вынясенне заведама неправасуднага прыгавору, рашэння, вызначэння або пастановы**

Вынясенне суддзямі заведама неправасуднага прыгавору, рашэння, вызначэння або пастановы,—

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін да трох год.

Тыя ж дзеянні, выклікаўшыя цяжкія вынікі,—

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад трох да дзесяці год.

**Артыкул 174. Заведама незаконны арышт або затрыманне**

Заведама незаконны арышт —

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін да аднаго года.

Заведама незаконнае затрыманне —

караецца папраўчымі работамі на тэрмін да аднаго года або звальненнем з пасады.

**Артыкул 175. Прымушэнне да дачы паказанняў**

Прымушэнне да дачы паказанняў шляхам ужывання пагроз або іншых незаконных дзеянняў з боку асобы, якая праводзіць дазнанне або папярэдняе следства,—

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін да трох год.

Тыя ж дзеянні, звязаныя з ужываннем насілля або са здзекамі з асобы дапытваемага,—

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад трох да дзесяці год.

**Артыкул 176. Заведама ілжывы данос**

Заведама ілжывы данос аб учыненні злачынства —

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін да двух год або папраўчымі работамі на тэрмін да аднаго года.

Тыя ж дзеянні, звязаныя з абвінавачаннем у асабліва небяспечным дзяржаўным ці іншым цяжкім злачынстве або са штучным стварэннем доказаў абвінавачання, а таксама ўчыненыя з карыслівай мэтай, —

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад двух да сямі год.

**Артыкул 177. Заведама ілжывае паказанне**

Заведама ілжывае паказанне сведкі, пацярпеўшага або заведама ілжывае заключэнне эксперта, а таксама заведама няправільны пераклад, зроблены перакладчыкам у судзе або пры правядзенні папярэдняга следства ці дазнання,—

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін да аднаго года або папраўчымі работамі на той жа тэрмін.

Тыя ж дзеянні, звязаныя з абвінавачаннем у асабліва небяспечным дзяржаўным ці іншым цяжкім злачынстве або са штучным стварэннем доказаў абвінавачання, а таксама ўчыненыя з карыслівай мэтай,—

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад двух да сямі год.

**Артыкул 178. Адмова ці ўхіленне сведкі або пацярпеўшага ад дачы паказанняў, або эксперта ад дачы заключэння**

Адмова ці ўхіленне сведкі або пацярпеўшага ад дачы паказанняў, або эксперта ад дачы заключэння ў судовым пасяджэнні або пры правядзенні папярэдняга следства ці дазнання, а таксама перашкоджанне яўцы сведкі, пацярпеўшага або дачы імі паказанняў —

караецца папраўчымі работамі на тэрмін да шасці месяцаў або штрафам да пяцідзесяці рублёў, або грамадскім ганьбаваннем.

**Артыкул 179. Прымушэнне сведкі ці пацярпеўшага да дачы ілжывых паказанняў, або эксперта да дачы ілжывага заключэння або подкуп гэтых асоб**

Прымушэнне сведкі, пацярпеўшага ці эксперта да дачы судова-следчым органам ілжывых паказанняў або ілжывага заключэння, учыненае шляхам пагрозы забойствам, насіллем, знішчэннем маёмасці гэтых асоб або іх блізкіх, а таксама подкуп сведкі, пацярпеўшага ці эксперта з мэтай дачы імі ілжывых паказанняў або ілжывага заключэння,—

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін да двух год або папраўчымі работамі на тэрмін да аднаго года.

**Артыкул 180. Разгалашэнне даных папярэдняга следства або дазнання**

Разгалашэнне даных папярэдняга следства або дазнання без дазволу пракурора, следчага ці асобы, якая праводзіць дазнанне,—

караецца папраўчымі работамі на тэрмін да шасці месяцаў або штрафам да пяцідзесяці рублёў.

**Артыкул 181. Растрата, адчужэнне або ўтойванне маёмасці, падвергнутай вопісу ці арышту**

Растрата, адчужэнне або ўтойванне маёмасці, падвергнутай вопісу ці арышту, учыненыя асобай, якой гэтая маёмасць даверана, —

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін да аднаго года або папраўчымі работамі на той жа тэрмін.

Артыкул 182. **Пабег з месца ссылкі**

Пабег з месца ссылкі або па дарозе ў ссылку —
караецца пазбаўленнем волі на тэрмін да аднаго года.

Артыкул 183. **Самавольнае вяртанне высланага ў месцы, забароненыя для пражывання**

Самавольнае вяртанне высланага ў месцы, забароненыя для пражывання, —
караецца заменай высылкі ссылкай на неадбыты тэрмін.

Артыкул 184. **Пабег з месца зняволення або з-пад варты**

Пабег з месца зняволення або з-пад варты, учынены асобай, якая адбывае пакаранне ці знаходзіцца ў папярэднім зняволенні, —
караецца пазбаўленнем волі на тэрмін да трох год.
Пабег, звязаны з насіллем над вартай,—
караецца пазбаўленнем волі на тэрмін да пяці год.

Артыкул 185. **Укрывальніцтва злачынстваў**

Укрывальніцтва злачынстваў, прадугледжаных артыкуламі 100 і 101 (наўмыснае забойства), 115, часткамі другой і трэцяй (згвалтаванне пры абцяжваючых акалічнасцях), 87, часткай трэцяй і 141, часткай трэцяй (крадзеж), 88, часткай трэцяй і 142, часткай трэцяй (грабеж), 89 і 143 (разбой), калі ўкрывальніцтва не было абяцана загадзя, —
караецца пазбаўленнем волі на тэрмін да трох год або папраўчымі работамі на тэрмін да аднаго года.

Артыкул 186. **Неданясенне аб злачынстве**

Неданясенне аб дакладна вядомых рыхтуемых або ўчыненых злачынствах, прадугледжаных артыкуламі 100 і 101 (наўмыснае забойства), 115, часткамі другой і трэцяй (згвалтаванне пры абцяжваючых акалічнасцях), 87, часткай трэцяй і 141, часткай трэцяй (крадзеж), 88, часткай трэцяй і 142, часткай трэцяй (грабеж), 89 і 143 (разбой),—
караецца пазбаўленнем волі на тэрмін да аднаго года або папраўчымі работамі на той жа тэрмін.

РАЗДЗЕЛ 14

## ЗЛАЧЫНСТВЫ СУПРАЦЬ ПАРАДКУ КІРАВАННЯ

### Артыкул 187. **Супраціўленне прадстаўніку ўлады або прадстаўніку грамадскасці, які выконвае абавязкі па ахове грамадскага парадку**

Супраціўленне прадстаўніку ўлады пры выкананні ім ускладзеных на яго законам абавязкаў або супраціўленне прадстаўніку грамадскасці, які выконвае абавязкі па ахове грамадскага парадку, або прымушэнне іх да выканання яўна незаконных дзеянняў, учыненыя з насіллем ці з пагрозай ужывання насілля, —

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін да трох год або папраўчымі работамі на тэрмін да аднаго года, або штрафам да пяцідзесяці рублёў.

### Артыкул 188. **Знявага прадстаўніка ўлады або прадстаўніка грамадскасці, які выконвае абавязкі па ахове грамадскага парадку**

Публічная знявага прадстаўніка ўлады або прадстаўніка грамадскасці, які выконвае абавязкі па ахове грамадскага парадку, у сувязі з выкананнем гэтымі асобамі ўскладзеных на іх абавязкаў —

караецца папраўчымі работамі на тэрмін да аднаго года або штрафам да пяцідзесяці рублёў, або выклікае прымяненне мер грамадскага ўздзеяння.

### Артыкул 189. **Пагроза або насілле ў адносінах да службовай асобы ці грамадскага работніка**

Пагроза забойствам, нанясеннем цяжкіх цялесных пашкоджанняў або знішчэннем маёмасці ў адносінах да службовай асобы ці грамадскага работніка з мэтай спынення іх службовай ці грамадскай дзейнасці або змянення яе характару ў інтарэсах пагражаючага —

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін да васьмі месяцаў або папраўчымі работамі на тэрмін да аднаго года, або штрафам да пяцідзесяці рублёў.

Нанясенне лёгкага цялеснага пашкоджання, пабояў ці ўчыненне іншых гвалтоўных дзеянняў у адносінах да службовай асобы ці грамадскага работніка ў сувязі з яго служ-

бовай дзейнасцю або выкананнем ім грамадскага абавязку —

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін да трох год або папраўчымі работамі на тэрмін да аднаго года.

Артыкул 190. **Самавольнае прысваенне звання або ўлады службовай асобы**

Самавольнае прысваенне звання або ўлады службовай асобы, звязанае з учыненнем на гэтай падставе якіх-небудзь грамадска небяспечных дзеянняў, —

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін да двух год або папраўчымі работамі на тэрмін да аднаго года.

Артыкул 191. **Крадзеж або пашкоджанне дакументаў, штампаў, пячатак, бланкаў**

Крадзеж, знішчэнне, пашкоджанне або ўтойванне дакументаў, штампаў, пячатак, бланкаў, якія знаходзяцца ў дзяржаўных установах, прадпрыемствах або грамадскіх арганізацыях, учыненыя з карыслівых ці іншых нізкіх намераў,—

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін да аднаго года або папраўчымі работамі на той жа тэрмін, або штрафам да ста рублёў.

Тыя ж дзеянні, учыненыя ў адносінах да дакументаў, штампаў, пячатак, бланкаў асаблівай важнасці або выклікаўшыя цяжкія вынікі, —

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін да пяці год.

Крадзеж у грамадзян пашпарта або іншых важных асабістых дакументаў —

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін да васьмі месяцаў або папраўчымі работамі на тэрмін да аднаго года, або штрафам да ста рублёў.

Артыкул 192. **Падробка, выраб або збыт фальшывых дакументаў, штампаў, пячатак, бланкаў**

Падробка пасведчання або іншага выдаваемага дзяржаўнай установай, прадпрыемствам ці грамадскай арганізацыяй дакумента, які дае правы або вызваляе ад абавязкаў, з мэтай выкарыстання такога дакумента самім падробнікам ці іншай асобай або збыт такога дакумента, а таксама выраб фальшывых штампаў, пячатак, бланкаў дзяржаўных устаноў, прадпрыемстваў ці грамадскіх арганізацый з той жа мэтай або збыт іх —

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін да двух год або папраўчымі работамі на тэрмін да аднаго года.

Тыя ж дзеянні, якія ўчыняюцца сістэматычна, —

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін да пяці год або ссылкай на той жа тэрмін.

Выкарыстанне заведама фальшывага дакумента —

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін да аднаго года або папраўчымі работамі на той жа тэрмін, або штрафам да трыццаці рублёў.

Артыкул 193. **Парушэнне правіл уезду або пражывання ў пагранічнай паласе**

Парушэнне правіл уезду, пражывання або прапіскі ў пагранічнай паласе, учыненае пасля накладання адміністрацыйнага спагнання за такое ж парушэнне, —

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін да шасці месяцаў або папраўчымі работамі на той жа тэрмін, або штрафам да пяцідзесяці рублёў.

Артыкул 194. **Парушэнне пашпартных правіл**

Злоснае парушэнне пашпартных правіл у мясцовасцях, дзе ўведзены спецыяльныя правілы пражывання і прапіскі, калі гэтае парушэнне выявілася ў пражыванні без пашпарта або без прапіскі і калі раней на асобу за гэта ўжо было двойчы накладзена адміністрацыйнае спагнанне,—

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін да аднаго года або папраўчымі работамі на той жа тэрмін, або штрафам да пяцідзесяці рублёў.

Артыкул 195. **Самавольны захоп зямлі і самавольнае будаўніцтва**

Самавольны захоп або самавольная мена, або купля-продаж зямельнага ўчастка ці іншыя дзеянні, якія парушаюць законы аб нацыяналізацыі зямлі, —

караюцца папраўчымі работамі на тэрмін ад шасці месяцаў да аднаго года або штрафам да ста рублёў.

Самавольнае будаўніцтва жылога будынка або самавольная прыбудова —

караецца папраўчымі работамі на тэрмін да аднаго года або штрафам да трохсот рублёў з канфіскацыяй незаконна ўзведзенай пабудовы або без канфіскацыі.

Артыкул 196. **Самаўпраўства**

Самаўпраўства, гэта значыць самавольнае, з парушэннем устаноўленага законам парадку, ажыццяўленне свайго

сапраўднага ці мяркуемага права, якое нанесла істотную шкоду грамадзянам або дзяржаўным ці грамадскім арганізацыям, —

караецца папраўчымі работамі на тэрмін да шасці месяцаў або штрафам да пяцідзесяці рублёў, або грамадскім ганьбаваннем, або выклікае прымяненне мер грамадскага ўздзеяння.

Артыкул 197. **Парушэнне законаў аб запісе актаў грамадзянскага стану**

Утойванне акалічнасцей, перашкаджаючых уступленню ў шлюб, або паведамленне ілжывых звестак органам запісу актаў грамадзянскага стану —

караецца папраўчымі работамі на тэрмін да аднаго года або штрафам да пяцідзесяці рублёў, або грамадскім ганьбаваннем.

Артыкул 198. **Незаконнае карыстанне знакамі Чырвонага Крыжа і Чырвонага Паўмесяца**

Незаконнае карыстанне знакамі Чырвонага Крыжа і Чырвонага Паўмесяца, а таксама назвай Чырвонага Крыжа і Чырвонага Паўмесяца —

караецца папраўчымі работамі на тэрмін да аднаго года або штрафам да ста рублёў, або грамадскім ганьбаваннем.

Артыкул 199. **Ухіленне ваеннаабавязаных ад праходжання ваенных збораў**

Ухіленне ваеннаабавязаных запасу ад праходжання ваенных збораў —

караецца папраўчымі работамі на тэрмін да шасці месяцаў або штрафам да пяцідзесяці рублёў.

Артыкул 200. **Парушэнне правіл уліку ваеннаабавязаных**

Парушэнне правіл, устаноўленых для ўліку ваеннаабавязаных, учыненае пасля ўжывання мер адміністрацыйнага ўздзеяння,—

караецца папраўчымі работамі на тэрмін да трох месяцаў або штрафам да трыццаці рублёў.

## РАЗДЗЕЛ 15

## ЗЛАЧЫНСТВЫ СУПРАЦЬ ГРАМАДСКАЙ БЯСПЕКІ, ГРАМАДСКАГА ПАРАДКУ І ЗДАРОЎЯ НАСЕЛЬНІЦТВА

### Артыкул 201. **Хуліганства**

Хуліганства, гэта значыць дзеянні, якія груба парушаюць грамадскі парадак і выражаюць яўную непавагу да грамадства,—

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін да аднаго года або папраўчымі работамі на той жа тэрмін, або штрафам да пяцідзесяці рублёў.

Злоснае хуліганства, гэта значыць тыя ж дзеянні, учыненыя асобай, раней судзімай за хуліганства, або звязаныя з супраціўленнем прадстаўніку ўлады ці прадстаўніку грамадскасці, які выконвае абавязкі па ахове грамадскага парадку, або тыя, якія вызначаюцца па свайму зместу выключным цынізмам ці дзёрзкасцю, або ўчыненыя асабліва небяспечным рэцыдывістам,—

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін да пяці год.

Дробнае хуліганства, учыненае асобай, да якой двойчы на працягу года прымяняліся меры грамадскага ці адміністрацыйнага ўздзеяння за дробнае хуліганства,—

караецца папраўчымі работамі на тэрмін да аднаго года або штрафам да пяцідзесяці рублёў.

### Артыкул 202. **Пагроза забойствам, нанясеннем цяжкіх цялесных пашкоджанняў або знішчэннем маёмасці**

Пагроза забойствам, нанясеннем цяжкіх цялесных пашкоджанняў або знішчэннем маёмасці шляхам падпалу, калі была рэальная небяспека выканання пагрозы,—

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін да шасці месяцаў або папраўчымі работамі на тэрмін да аднаго года, або штрафам да трыццаці рублёў, або выклікае прымяненне мер грамадскага ўздзеяння.

### Артыкул 203. **Набыццё маёмасці, здабытай заведама злачынным шляхам**

Набыццё маёмасці, здабытай заведама злачынным шляхам,—

караецца папраўчымі работамі на тэрмін да шасці меся-

цаў або штрафам да ста рублёў, або грамадскім ганьбаваннем, або выклікае прымяненне мер грамадскага ўздзеяння.

Тыя ж дзеянні, учыненыя ў выглядзе промыслу або ў вялікіх размерах,—

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін да пяці год з канфіскацыяй маёмасці або без канфіскацыі або ссылкай на тэрмін да пяці год з канфіскацыяй маёмасці або без канфіскацыі.

Артыкул 204. **Сістэматычнае займанне бадзяжніцтвам або папрашайніцтвам**

Сістэматычнае займанне бадзяжніцтвам або папрашайніцтвам, якое працягваецца пасля паўторнага папярэджання, зробленага адміністрацыйнымі органамі,—

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін да двух год або папраўчымі работамі на тэрмін ад шасці месяцаў да аднаго года.

Артыкул 205. **Уцягненне непаўналетніх у злачынную дзейнасць**

Уцягненне непаўналетніх у злачынную дзейнасць, у займанне папрашайніцтвам, прастытуцыяй, азартнымі гульнямі, а таксама выкарыстанне непаўналетніх для мэт паразітычнага існавання —

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін да пяці год.

Артыкул 206. **Парушэнне правіл бяспекі руху і эксплуатацыі аўтамотатранспарту або гарадскога электратранспарту**

Парушэнне работнікам аўтамотатранспарту або гарадскога электратранспарту правіл бяспекі руху і эксплуатацыі транспарту, выклікаўшае нанясенне пацярпеўшаму менш цяжкага ці лёгкага цялеснага пашкоджання або нанёсшае істотную матэрыяльную шкоду,—

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін да двух год або папраўчымі работамі на тэрмін да аднаго года з пазбаўленнем права кіраваць транспартнымі сродкамі на тэрмін да двух год ці без пазбаўлення, або штрафам да ста рублёў.

Тыя ж дзеянні, выклікаўшыя смерць пацярпеўшага або нанясенне яму цяжкага цялеснага пашкоджання,—

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін да дзесяці год з пазбаўленнем права кіраваць транспартнымі сродкамі на тэрмін да трох год або без пазбаўлення.

Артыкул 207. **Парушэнне правіл бяспекі руху аўтамататранспарту асобай, якая не з'яўляецца работнікам аўтамататранспарту**

Парушэнне правіл бяспекі руху аўтамататранспарту асобай, якая не з'яўляецца работнікам аўтамататранспарту, выклікаўшае нанясенне пацярпеўшаму менш цяжкага або лёгкага цялеснага пашкоджання,—

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін да двух год або папраўчымі работамі на тэрмін да аднаго года з пазбаўленнем права кіраваць аўтамататранспартам да двух год або без пазбаўлення.

Тыя ж дзеянні, выклікаўшыя смерць пацярпеўшага або нанясенне яму цяжкага цялеснага пашкоджання,—

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін да дзесяці год з пазбаўленнем права кіраваць аўтамататранспартам да трох год або без пазбаўлення.

Артыкул 208. **Парушэнне дзеючых на транспарце правіл**

Парушэнне дзеючых на транспарце правіл аб ахове парадку і бяспекі руху, калі гэта выклікала гібель людзей ці іншыя цяжкія вынікі,—

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін да пяці год.

Артыкул 209. **Парушэнне правіл бяспекі горных работ**

Парушэнне правіл бяспекі горных работ, калі яно нанесла шкоду здароўю людзей,—

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін да аднаго года або папраўчымі работамі на той жа тэрмін.

Тое ж парушэнне, калі яно выклікала гібель людзей або іншыя цяжкія вынікі,—

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін да пяці год або папраўчымі работамі на тэрмін да аднаго года.

Артыкул 210. **Парушэнне правіл пры выкананні будаўнічых работ**

Парушэнне пры выкананні будаўнічых работ будаўнічых, санітарных і праціпажарных правіл, а таксама парушэнне правіл эксплуатацыі будаўнічых механізмаў, калі яно нанесла шкоду здароўю людзей,—

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін да аднаго года або папраўчымі работамі на той жа тэрмін.

Тое ж парушэнне, калі яно выклікала гібель людзей або іншыя цяжкія вынікі,—
караецца пазбаўленнем волі на тэрмін да пяці год або папраўчымі работамі на тэрмін да аднаго года.

Артыкул 211. **Парушэнне вытворча-тэхнічнай дысцыпліны або правіл бяспекі на выбухованебяспечных прадпрыемствах і ў выбухованебяспечных цэхах**

Парушэнне вытворча-тэхнічнай дысцыпліны або правіл, якія забяспечваюць бяспеку вытворчасці на выбухованебяспечных прадпрыемствах ці ў выбухованебяспечных цэхах,—
караецца папраўчымі работамі на тэрмін да аднаго года або штрафам да ста рублёў, або звальненнем з пасады.
Тыя ж дзеянні, калі яны выклікалі гібель людзей або іншыя цяжкія вынікі,—
караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін да сямі год.

Артыкул 212. **Парушэнне правіл хавання, выкарыстання, уліку або перавозкі выбуховых і радыёактыўных рэчываў**

Парушэнне правіл хавання, выкарыстання, уліку або перавозкі выбуховых і радыёактыўных рэчываў, а таксама незаконная перасылка гэтых рэчываў па пошце ці багажом, калі гэтыя дзеянні маглі выклікаць цяжкія вынікі,—
караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін да аднаго года або папраўчымі работамі на той жа тэрмін.
Тыя ж дзеянні, калі яны выклікалі цяжкія вынікі, —
караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін да сямі год.

Артыкул 213. **Незаконнае нашэнне, хаванне, выраб або збыт зброі ці выбуховых рэчываў**

Нашэнне, хаванне, выраб або збыт агнястрэльнай зброі (апрача гладкаствольнай паляўнічай), баявых прыпасаў або выбуховых рэчываў без адпаведнага дазволу —
караецца пазбаўленнем волі на тэрмін да двух год або папраўчымі работамі на тэрмін да аднаго года, або штрафам да ста рублёў.
Нашэнне, выраб або збыт кінжалаў, фінскіх нажоў ці іншай халоднай зброі без адпаведнага дазволу —
караецца пазбаўленнем волі на тэрмін да аднаго года або папраўчымі работамі на той жа тэрмін, або штрафам да трыццаці рублёў.

Артыкул 214. **Неахайнае хаванне агнястрэльнай зброі**

Неахайнае хаванне агнястрэльнай зброі, якое стварыла ўмовы для выкарыстання гэтай зброі іншай асобай, калі гэта выклікала цяжкія вынікі,—

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін да аднаго года або папраўчымі работамі на той жа тэрмін.

Артыкул 215. **Незаконная перасылка лёгкіх на загаранне або едкіх рэчываў**

Незаконная перасылка па пошце ці багажом лёгкіх на загаранне або едкіх рэчываў, калі гэта выклікала цяжкія вынікі, —

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін да трох год або папраўчымі работамі на тэрмін да аднаго года.

Артыкул 216. **Незаконнае лячэнне**

Заняцце лячэннем як прафесіяй асобай, якая не мае належнай медыцынскай адукацыі,—

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін да аднаго года або папраўчымі работамі на той жа тэрмін, або штрафам да трохсот рублёў, або выклікае прымяненне мер грамадскага ўздзеяння.

Артыкул 217. **Парушэнне правіл, устаноўленых з мэтай барацьбы з эпідэміямі**

Парушэнне абавязковых правіл, устаноўленых з мэтай папярэджання эпідэмічных і іншых заразных захворванняў і з мэтай барацьбы з імі, калі яно выклікала распаўсюджанне заразных захворванняў,—

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін да аднаго года або папраўчымі работамі на той жа тэрмін, або штрафам да пяцідзесяці рублёў.

Артыкул 218. **Забруджванне вадаёмаў і паветра**

Забруджванне рэк, азёр і іншых вадаёмаў і водных крыніц неачышчанымі і неабясшкоджанымі сцёкавымі водамі, адкідамі або адходамі прамысловых і камунальных прадпрыемстваў, якое можа нанесці шкоду здароўю людзей або сельскагаспадарчай вытворчасці, ці рыбным запасам, а таксама забруджванне паветра шкоднымі для здароўя людзей адходамі прамысловай вытворчасці —

караецца папраўчымі работамі на тэрмін да аднаго года або штрафам да трохсот рублёў.

Артыкул 219. **Выраб або збыт ядавітых ці наркатычных рэчываў**

Выраб, збыт, а таксама хаванне або набыццё з мэтай збыту моцнадзеючых, ядавітых або наркатычных рэчываў без спецыяльнага на тое дазволу, а таксама парушэнне ўстаноўленых правіл вырабу, хавання, водпуску, уліку, перавозкі, перасылкі моцнадзеючых, ядавітых або наркатычных сродкаў —

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін да аднаго года або папраўчымі работамі на той жа тэрмін, або штрафам да ста рублёў.

Тыя ж дзеянні, якія ўчыняюцца сістэматычна, —

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін да пяці год.

Артыкул 220. **Сяўба опіумнага маку або індыйскіх канапель без дазволу**

Сяўба опіумнага маку або індыйскіх канапель без належнага дазволу —

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін да двух год або папраўчымі работамі на тэрмін да аднаго года з абавязковай канфіскацыяй пасеваў.

Артыкул 221. **Утрыманне прытонаў і зводніцтва**

Утрыманне прытонаў распусты, зводніцтва з карыслівай мэтай, а таксама ўтрыманне прытонаў для ўжывання наркотыкаў —

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін да пяці год з высылкай або без высылкі з канфіскацыяй маёмасці або без канфіскацыі, або ссылкай на той жа тэрмін з канфіскацыяй маёмасці або без канфіскацыі.

Артыкул 222. **Замах на асобу і правы грамадзян пад выглядам выканання рэлігійных абрадаў**

Арганізацыя або кіраўніцтва групай, дзейнасць якой, праводзімая пад выглядам прапаведвання рэлігійных веравучэнняў і выканання рэлігійных абрадаў, звязана з нанясеннем шкоды здароўю грамадзян або з іншымі замахамі на асобу ці на правы грамадзян, а таксама са схіленнем грамадзян да адмовы ад грамадскай дзейнасці або выканання грамадзянскіх абавязкаў,—

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін да пяці год або ссылкай на той жа тэрмін з канфіскацыяй маёмасці або без канфіскацыі.

Актыўны ўдзел у дзейнасці групы, указанай у частцы пер-

шай гэтага артыкула, а таксама сістэматычная прапаганда, накіраваная да ўчынення ўказаных у ёй дзеянняў,—

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін да трох год або ссылкай на той жа тэрмін, або папраўчымі работамі на тэрмін да аднаго года.

Калі дзеянні асоб, указаных у другой частцы гэтага артыкула, і самі асобы, якія іх учынілі, не маюць вялікай грамадскай небяспекі, да іх могуць быць прыменены меры грамадскага ўздзеяння.

Артыкул 223. **Выраб або збыт парнаграфічных прадметаў**

Выраб, распаўсюджанне або рэкламаванне парнаграфічных твораў, друкаваных выданняў, адбіткаў або іншых прадметаў парнаграфічнага характару, а таксама гандаль імі або хаванне з мэтай іх продажу ці распаўсюджання —

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін да трох год або штрафам да ста рублёў з канфіскацыяй парнаграфічных прадметаў і сродкаў іх вырабу.

Артыкул 224. **Насмяянне з магілы**

Насмяянне з магілы, а таксама крадзеж прадметаў, якія знаходзяцца ў магіле ці на магіле,—

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін да трох год або папраўчымі работамі на тэрмін да аднаго года.

Артыкул 225. **Наўмыснае знішчэнне, разбурэнне або псаванне помнікаў культуры**

Наўмыснае знішчэнне, разбурэнне або псаванне помнікаў культуры ці прыродных аб'ектаў, узятых пад ахову дзяржавы,—

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін да двух год або папраўчымі работамі на тэрмін да аднаго года, або штрафам да ста рублёў.

## РАЗДЗЕЛ 16

## ВОІНСКІЯ ЗЛАЧЫНСТВЫ

Артыкул 226. **Паняцце воінскага злачынства**

Воінскімі злачынствамі прызнаюцца прадугледжаныя гэтым Кодэксам злачынствы супраць устаноўленага парадку нясення воінскай службы, учыненыя ваеннаслужачымі, а таксама ваеннаабавязанымі ў час праходжання імі вучэбных збораў.

Па адпаведных артыкулах гэтага Кодэкса нясуць адказнасць за злачынствы супраць устаноўленага для іх парадку нясення службы асобы афіцэрскага, сержанцкага і радавога саставу органаў дзяржаўнай бяспекі, а таксама асобы, адносна якіх ёсць спецыяльнае ўказанне ў заканадаўстве Саюза ССР.

Саўдзел у воінскіх злачынствах асоб, не памянёных у гэтым артыкуле, выклікае адказнасць па адпаведных артыкулах гэтага Кодэкса.

Артыкул 227. **Непадпарадкаванне**

а) Непадпарадкаванне, гэта значыць адкрытая адмова ад выканання загаду начальніка, а таксама іншае наўмыснае невыкананне загаду —

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад аднаго да пяці год.

б) Тое ж дзеянне, учыненае групай асоб або выклікаўшае цяжкія вынікі,—

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад трох да дзесяці год.

в) Непадпарадкаванне, учыненае ў ваенны час або ў баявой абстаноўцы, —

караецца смерцю або пазбаўленнем волі на тэрмін ад пяці да дзесяці год.

Артыкул 228. **Невыкананне загаду**

а) Невыкананне загаду начальніка, учыненае пры адсутнасці прыкмет, указаных у пункце «а» артыкула 227 гэтага Кодэкса,—

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад трох месяцаў да трох год.

б) Тое ж дзеянне пры наяўнасці змякчаючых акалічнасцей —

выклікае прымяненне правіл Дысцыплінарнага статута Узброеных Сіл Саюза ССР.

в) Дзеянне, прадугледжанае пунктам «а» гэтага артыкула, учыненае ў ваенны час або ў баявой абстаноўцы, —

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад трох да дзесяці год.

Артыкул 229. **Супраціўленне начальніку або прымушэнне яго да парушэння службовых абавязкаў**

а) Супраціўленне начальніку, а таксама іншай асобе, якая выконвае ўскладзеныя на яе абавязкі па ваеннай службе, або

прымушэнне яе да парушэння гэтых абавязкаў —
караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад аднаго да пяці год.

б) Тыя ж дзеянні, учыненыя групай асоб або з ужываннем зброі, або выклікаўшыя цяжкія вынікі,—
караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад трох да дзесяці год.

в) Дзеянні, прадугледжаныя пунктам «б» гэтага артыкула, калі яны звязаны з наўмысным забойствам начальніка або іншай асобы, якая выконвае абавязкі па ваеннай службе, або былі ўчынены ў ваенны час ці ў баявой абстаноўцы,—
караюцца смерцю або пазбаўленнем волі на тэрмін ад пяці да пятнаццаці год.

Артыкул 230. **Пагроза начальніку**

а) Пагроза забойствам, нанясеннем цялесных пашкоджанняў або нанясеннем пабояў начальніку ў сувязі з выкананнем ім абавязкаў па ваеннай службе —
караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад трох месяцаў да трох год.

б) Тое ж дзеянне пры змякчаючых акалічнасцях —
выклікае прымяненне правіл Дысцыплінарнага статута Узброеных Сіл Саюза ССР.

в) Дзеянне, прадугледжанае пунктам «а» гэтага артыкула, учыненае ў ваенны час або ў баявой абстаноўцы,—
караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад трох да дзесяці год.

Артыкул 231. **Насільныя дзеянні ў адносінах да начальніка**

а) Нанясенне цялесных пашкоджанняў або пабояў начальніку ў сувязі з выкананнем ім абавязкаў па ваеннай службе —
караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад двух да дзесяці год.

б) Тыя ж дзеянні, учыненыя ў ваенны час або ў баявой абстаноўцы, калі яны выклікалі цяжкія вынікі,—
караюцца смерцю або пазбаўленнем волі на тэрмін ад пяці да пятнаццаці год.

Артыкул 232. **Знявага падначаленым начальніка і начальнікам падначаленага**

а) Знявага на словах або ненасільным дзеяннем падначаленым начальніка або малодшым старшага, а таксама началь-

нікам падначаленага або старшым малодшага пры выкананні хоць бы адным з іх абавязкаў па ваеннай службе—

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад трох да шасці месяцаў.

б) Тыя ж дзеянні пры змякчаючых акалічнасцях —

выклікаюць прымяненне правіл Дысцыплінарнага статута Узброеных Сіл Саюза ССР.

в) Знявага насільным дзеяннем, нанесеная пры ўмовах, указаных у пункце «а» гэтага артыкула,—

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад шасці месяцаў да пяці год.

Артыкул 233. **Знявага насільным дзеяннем адным ваеннаслужачым другога пры адсутнасці паміж імі адносін падначаленасці або старшынства**

а) Знявага насільным дзеяннем адным ваеннаслужачым другога, калі яны не знаходзяцца паміж сабой у адносінах падначаленасці або старшынства і калі хоць бы адзін з іх знаходзіўся пры выкананні абавязкаў па ваеннай службе,—

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад трох месяцаў да аднаго года.

б) Тое ж дзеянне пры змякчаючых акалічнасцях —

выклікае прымяненне правіл Дысцыплінарнага статута Узброеных Сіл Саюза ССР.

Артыкул 234. **Самавольная адлучка**

а) Самавольная адлучка з часці або з месца службы ваеннаслужачага тэрміновай службы, а таксама няяўка яго ў тэрмін без уважлівых прычын на службу пры звальненні з часці, пры назначэнні, пераводзе, з камандзіроўкі, з водпуску або з лячэбнай установы працягласцю звыш адных сутак, але не больш трох сутак, або хоць і менш сутак, але ўчыненая паўторна на працягу трох месяцаў,—

караецца накіраваннем у дысцыплінарны батальён на тэрмін ад трох месяцаў да двух год.

б) Тыя ж дзеянні, учыненыя ў ваенны час,—

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад двух да дзесяці год.

в) Дзеянні, прадугледжаныя пунктам «а» гэтага артыкула, учыненыя ваеннаслужачым, які адбывае пакаранне ў дысцыплінарным батальёне,—

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад аднаго да трох год.

Артыкул 235. **Самавольнае пакіданне часці або месца службы**

а) Самавольнае пакіданне часці або месца службы ваеннаслужачым тэрміновай службы, а таксама няяўка яго ў тэрмін без уважлівых прычын на службу пры звальненні з часці, пры назначэнні, пераводзе, з камандзіроўкі, з водпуску або з лячэбнай установы працягласцю звыш трох сутак —

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад аднаго да пяці год.

б) Тыя ж дзеянні, учыненыя ў ваенны час,—

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад пяці да дзесяці год.

в) Самавольнае пакіданне часці або месца службы асобай афіцэрскага саставу або ваеннаслужачым звыштэрміновай службы, а таксама няяўка яго ў тэрмін на службу без уважлівых прычын працягласцю звыш дзесяці сутак —

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад аднаго да пяці год.

г) Дзеянні, прадугледжаныя пунктам «в» гэтага артыкула, учыненыя ў ваенны час, калі самавольная адсутнасць працягвалася звыш адных сутак,—

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад пяці да дзесяці год.

Артыкул 236. **Дэзерцірства**

а) Дэзерцірства, гэта значыць пакіданне воінскай часці або месца службы з мэтай ухіліцца ад ваеннай службы, а таксама няяўка з той жа мэтай на службу пры назначэнні, пераводзе, з камандзіроўкі, з водпуску або з лячэбнай установы, учыненае ваеннаслужачым тэрміновай службы,—

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад трох да сямі год.

б) Тыя ж дзеянні, учыненыя ў ваенны час, —

караюцца смерцю або пазбаўленнем волі на тэрмін ад пяці да дзесяці год.

в) Дэзерцірства, учыненае асобай афіцэрскага саставу або ваеннаслужачым звыштэрміновай службы,—

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад пяці да сямі год.

г) Тое ж дзеянне, учыненае ў ваенны час,—

караецца смерцю або пазбаўленнем волі на тэрмін ад сямі да дзесяці год.

Артыкул 237. **Самавольнае пакіданне часці ў баявой абстаноўцы**

Самавольнае пакіданне часці або месца службы ў баявой абстаноўцы, незалежна ад працягласці, —

караецца смерцю або пазбаўленнем волі на тэрмін ад трох да дзесяці год.

Артыкул 238. **Ухіленне ад воінскай службы шляхам самакалецтва або іншым спосабам**

а) Ухіленне ваеннаслужачага ад нясення абавязкаў ваеннай службы шляхам нанясення сабе якога-небудзь пашкоджання (самакалецтва) або шляхам сімуляцыі хваробы, падлогу дакументаў або іншага падману, а таксама адмова ад нясення абавязкаў ваеннай службы —

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад трох да сямі год.

б) Тыя ж дзеянні, учыненыя ў ваенны час або ў баявой абстаноўцы,—

караюцца смерцю або пазбаўленнем волі на тэрмін ад пяці да дзесяці год.

Артыкул 239. **Праматанне або страта ваеннай маёмасці**

а) Продаж, залог або перадача ў карыстанне ваеннаслужачым тэрміновай службы выдадзеных яму для асабістага карыстання прадметаў абмундзіравання або амуніцыі (праматанне), а таксама страта або псаванне гэтых прадметаў у выніку парушэння правіл іх зберажэння —

караюцца накіраваннем у дысцыплінарны батальён на тэрмін ад трох месяцаў да аднаго года.

б) Тыя ж дзеянні пры змякчаючых акалічнасцях —

выклікаюць прымяненне правіл Дысцыплінарнага статута Узброеных Сіл Саюза ССР.

в) Дзеянні, прадугледжаныя пунктам «а» гэтага артыкула, учыненыя ў ваенны час або ў баявой абстаноўцы,—

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад аднаго да пяці год.

г) Страта або псаванне дaвераных для службовага карыстання зброі, боепрыпасаў, сродкаў перамяшчэння, прадметаў тэхнічнага забеспячэння або іншай ваеннай маёмасці ў выніку парушэння правіл іх зберажэння,—

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад аднаго да трох год.

д) Дзеянні, прадугледжаныя пунктам «г» гэтага артыкула, учыненыя ў ваенны час або ў баявой абстаноўцы,—

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад двух да сямі год.

### Артыкул 240. Наўмыснае знішчэнне або пашкоджанне ваеннай маёмасці

а) Наўмыснае знішчэнне або пашкоджанне зброі, боепрыпасаў, сродкаў перамяшчэння, ваеннай тэхнікі або іншай ваеннай маёмасці пры адсутнасці прыкмет асабліва небяспечнага дзяржаўнага злачынства—

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад аднаго да пяці год.

б) Тое ж дзеянне, калі яно выклікала цяжкія вынікі,—

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад трох да дзесяці год.

в) Дзеянне, прадугледжанае пунктам «б» гэтага артыкула, учыненае ў ваенны час або ў баявой абстаноўцы,—

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад пяці да дзесяці год або смерцю.

### Артыкул 241. Парушэнне правіл ваджэння або эксплуатацыі машын

Парушэнне правіл ваджэння або эксплуатацыі баявой, спецыяльнай ці транспартнай машыны, выклікаўшае няшчасныя выпадкі з людзьмі або іншыя цяжкія вынікі,—

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад двух да дзесяці год.

### Артыкул 242. Парушэнне правіл палётаў або падрыхтоўкі да іх

Парушэнне правіл палётаў або падрыхтоўкі да іх, якое выклікала катастрофу ці іншыя цяжкія вынікі,—

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад трох да дзесяці год.

### Артыкул 243. Парушэнне правіл караблеваджэння

Парушэнне правіл караблеваджэння, выклікаўшае гібель або сур'ёзныя пашкоджанні карабля, чалавечыя ахвяры ці іншыя цяжкія вынікі,—

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад трох да дзесяці год.

**Артыкул 244. Парушэнне статутных правіл каравульнай службы**

а) Парушэнне статутных правіл каравульнай (вахтавай) або канвойнай службы і выдадзеных у развіццё гэтых правіл загадаў і распараджэнняў —

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад трох да шасці месяцаў.

б) Тое ж дзеянне пры змякчаючых акалічнасцях —

выклікае прымяненне правіл Дысцыплінарнага статута Узброеных Сіл Саюза ССР.

в) Парушэнне статутных правіл каравульнай (вахтавай) службы, учыненае ў каравулах пры складах зброі і боепрыпасаў, а таксама ў іншых каравулах і на пастах па ахове аб'ектаў, якія маюць асабліва важнае дзяржаўнае і ваеннае значэнне,—

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад шасці месяцаў да трох год.

г) Дзеянне, прадугледжанае пунктам «в» гэтага артыкула, учыненае ў ваенны час або ў баявой абстаноўцы, —

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад двух да сямі год.

д) Парушэнне статутных правіл каравульнай (вахтавай) або канвойнай службы, якое суправаджалася наступленнем шкодных вынікаў, для папярэджання якіх устаноўлен дадзены каравул ці канвой, —

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад аднаго да дзесяці год.

е) Дзеянне, прадугледжанае пунктам «д» гэтага артыкула, учыненае ў ваенны час або ў баявой абстаноўцы, —

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад трох да дзесяці год або смерцю.

**Артыкул 245. Парушэнне правіл нясення пагранічнай службы**

а) Парушэнне правіл нясення пагранічнай службы асобай, якая ўваходзіць у склад нарада па ахове дзяржаўнай граніцы СССР, —

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад аднаго да трох год.

б) Тое ж дзеянне пры змякчаючых акалічнасцях —

выклікае прымяненне правіл Дысцыплінарнага статута Узброеных Сіл Саюза ССР.

в) Дзеянне, прадугледжанае пунктам «а» гэтага артыкула, выклікаўшае цяжкія вынікі, —

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад трох да дзесяці год.

Артыкул 246. **Парушэнне правіл нясення службы на радыётэхнічных пастах і ў дзяжурных падраздзяленнях**

а) Парушэнне правіл нясення службы на радыётэхнічных пастах, у дзяжурных падраздзяленнях і іншых аб'ектах, прызначаных для прадухілення парушэння паветранай ці марской прасторы СССР, —

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад аднаго да пяці год.

б) Тое ж дзеянне пры змякчаючых акалічнасцях —

выклікае прымяненне правіл Дысцыплінарнага статута Узброеных Сіл Саюза ССР.

в) Дзеянне, прадугледжанае пунктам «а» гэтага артыкула, выклікаўшае цяжкія вынікі, —

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад трох да дзесяці год.

г) Дзеянні, прадугледжаныя пунктамі «а» і «в» гэтага артыкула, учыненыя ў ваенны час, —

караюцца смерцю або пазбаўленнем волі на тэрмін ад пяці да пятнаццаці год.

Артыкул 247. **Парушэнне статутных правіл унутранай службы**

а) Парушэнне асобай, якая ўваходзіць у сутачны нарад часці (апрача каравула і вахты), статутных правіл унутранай службы —

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад трох да шасці месяцаў.

б) Тое ж дзеянне пры змякчаючых акалічнасцях —

выклікае прымяненне правіл Дысцыплінарнага статута Узброеных Сіл Саюза ССР.

в) Дзеянне, прадугледжанае пунктам «а» гэтага артыкула, калі яно выклікала шкодныя вынікі, папярэджанне якіх уваходзіла ў абавязак данай асобы,—

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад шасці месяцаў да двух год.

г) Дзеянне, прадугледжанае пунктам «в» гэтага артыкула, учыненае ў ваенны час або ў баявой абстаноўцы,—

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад аднаго да пяці год.

Артыкул 248. **Разгалашэнне ваеннай тайны або страта дакументаў, якія маюць ваенную тайну**

а) Разгалашэнне звестак ваеннага характару, якія складаюць дзяржаўную тайну, пры адсутнасці прыкмет здрады радзіме,—

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад двух да пяці год.

б) Страта дакументаў, у якіх ёсць звесткі ваеннага характару, што складаюць дзяржаўную тайну, або прадметаў, звесткі аб якіх складаюць дзяржаўную тайну, асобай, якой гэтыя дакументы або прадметы былі даверанры, калі страта з'явілася вынікам парушэння ўстаноўленых правіл абыходжання з указанымі дакументамі ці прадметамі,—

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад аднаго да трох год.

в) Дзеянні, прадугледжаныя пунктамі «а» і «б» гэтага артыкула, калі яны выклікалі цяжкія вынікі,—

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад пяці да дзесяці год.

г) Разгалашэнне ваенных звестак, якія не падлягаюць агалашэнню, але не з'яўляюцца дзяржаўнай тайнай,—

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад трох месяцаў да аднаго года.

д) Дзеянне, прадугледжанае пунктам «г» гэтага артыкула, пры змякчаючых акалічнасцях —

выклікае прымяненне правіл Дысцыплінарнага статута Узброеных Сіл Саюза ССР.

Артыкул 249. **Злоўжыванне ўладай, перавышэнне ўлады і нядбайныя адносіны да службы**

а) Злоўжыванне начальніка або службовай асобы ўладай ці службовым становішчам, бяздзейнасць або перавышэнне ўлады, а таксама нядбайныя адносіны да службы, калі гэтыя дзеянні ўчыняліся сістэматычна або з карыслівых намераў, або іншай асабістай зацікаўленасці, а таксама калі яны прынеслі істотную шкоду,—

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад шасці месяцаў да дзесяці год.

б) Тыя ж дзеянні пры змякчаючых акалічнасцях —

выклікаюць прымяненне правіл Дысцыплінарнага статута Узброеных Сіл Саюза ССР.

в) Дзеянні, прадугледжаныя пунктам «а» гэтага артыкула, учыненыя ў ваенны час або ў баявой абстаноўцы,—

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад трох да дзесяці год або смерцю.

**Артыкул 250. Здача або пакіданне праціўніку сродкаў вядзення вайны**

Здача праціўніку начальнікам давераных яму ваенных сіл, а таксама не выклікане баявой абстаноўкай пакіданне праціўніку ўмацаванняў, баявой тэхнікі і іншых сродкаў вядзення вайны, калі ўказаныя дзеянні ўчынены не з мэтай садзейнічання ворагу,—

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад трох да дзесяці год або смерцю.

**Артыкул 251. Пакіданне гінучага ваеннага карабля**

а) Пакіданне гінучага ваеннага карабля камандзірам, які не выканаў да канца сваіх службовых абавязкаў, а таксама асобай са складу каманды карабля без адпаведнага на тое распараджэння камандзіра —

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад пяці да дзесяці год.

б) Тое ж дзеянне, учыненае ў ваенны час або ў баявой абстаноўцы,—

караецца смерцю або пазбаўленнем волі на тэрмін ад дзесяці да пятнаццаці год.

**Артыкул 252. Самавольнае пакіданне поля бітвы або адмова дзейнічаць зброяй**

Самавольнае пакіданне поля бітвы ў час бою або адмова ў час бою дзейнічаць зброяй —

караецца смерцю або пазбаўленнем волі тэрмінам на пятнаццаць год.

**Артыкул 253. Добраахвотная здача ў палон**

Добраахвотная здача ў палон па баязлівасці ці маладушнасці —

караецца смерцю або пазбаўленнем волі тэрмінам на пятнаццаць год.

**Артыкул 254. Злачынныя дзеянні ваеннаслужачага, які знаходзіцца ў палоне**

а) Добраахвотны ўдзел ваеннаслужачага, які знаходзіцца ў палоне, у работах, што маюць ваеннае значэнне, або ў іншых

мерапрыемствах, якія заведама могуць нанесці шкоду Савецкаму Саюзу ці саюзным з ім дзяржавам, пры адсутнасці прыкмет здрады радзіме,—

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад трох да дзесяці год.

б) Насілле над іншымі ваеннапалоннымі або жорсткае абыходжанне з імі з боку ваеннапалоннага, які знаходзіцца на становішчы старшага,—

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад трох да дзесяці год.

в) Учыненне ваеннаслужачым, які знаходзіцца ў палоне, дзеянняў, накіраваных на шкоду іншым ваеннапалонным, з карыслівых матываў або з мэтай забеспячэння спагадлівых да сябе адносін з боку праціўніка,—

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад аднаго да трох год.

Артыкул 255. **Марадзёрства**

Крадзеж на полі бітвы рэчаў, якія знаходзяцца пры забітых і раненых (марадзёрства),—

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад трох да дзесяці год або смерцю.

Артыкул 256. **Насілле над насельніцтвам у раёне ваенных дзеянняў**

Разбой, процізаконнае знішчэнне маёмасці, насілле, а таксама процізаконнае адабранне маёмасці пад выглядам ваеннай неабходнасці, якія ўчыняюцца ў адносінах да насельніцтва ў раёне ваенных дзеянняў,—

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад трох да дзесяці год або смерцю.

Артыкул 257. **Дрэннае абыходжанне з ваеннапалоннымі**

а) Дрэннае абыходжанне з ваеннапалоннымі, якое мела месца неаднаразова, або звязанае з асаблівай жорсткасцю, або накіраванае супраць хворых і раненых, а таксама неахайнае выкананне абавязкаў у адносінах да хворых і раненых асобамі, на якіх ускладзены лячэнне іх і апека аб іх, пры адсутнасці прыкмет больш цяжкага злачынства,—

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад аднаго да трох год.

б) Дрэннае абыходжанне з ваеннапалоннымі без указаных абцяжваючых акалічнасцей —

выклікае прымяненне правіл Дысцыплінарнага статута Узброеных Сіл Саюза ССР.

Артыкул 258. **Незаконнае нашэнне знакаў Чырвонага Крыжа і Чырвонага Паўмесяца і злоўжыванне імі**

Нашэнне ў раёне ваенных дзеянняў знакаў Чырвонага Крыжа або Чырвонага Паўмесяца асобамі, якія не маюць на тое права, а таксама злоўжыванне ў ваенны час флагамі або знакамі Чырвонага Крыжа і Чырвонага Паўмесяца, або афарбоўкай, прысвоенай транспартным сродкам санітарнай эвакуацыі,—

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад трох месяцаў да аднаго года.

Дадатак

## ПЕРАЛІК

## маёмасці, якая не падлягае канфіскацыі па прыгавору суда

